Т. Л. Ляшчынская С. С. Аніскевіч

# Беларуская мова 3

Частка 2









Паліваць — паліць.
Апранаць — апрануць.
Выгульваць — выгуляць.
Мыць — памыць.





Што робіць Алена?
Што робіць Алесік?
Што робіць Ганна?
Што зрабіў Васілька?







Т. Л. Ляшчынская  С. С. Аніскевіч

# Беларуская мова

**Вучэбны дапаможнік для 3 класа першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання**

У дзвюх частках
Частка 2

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2019

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 811.161.3(075.3-056.3)
ББК 81.411.3я721
Л99

Рэцэнзенты:
кафедра беларускага і рускага моваэнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (дацэнт кафедры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. Г. Міхалевіч*);
настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Чэхаўшчынская дапаможная школа-інтэрнат» *Н. Г. Рубацкая*

## Умоўныя абазначэнні

— правіла

 — **Паразмаўляем** — камунікатыўнае практыкаванне

 — **Хвілінка-весялінка** — практыкаванне займальнага характару

* — заданне павышанай складанасці

! — звярніце ўвагу

**Ляшчынская, Т. Л.**
Л99 Беларуская мова : вучэб. дапам. для 3-га кл. першага аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання : у 2 ч. Ч. 2 / Т. Л. Ляшчынская, С. С. Аніскевіч. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. — 131 с. : іл.
ISBN 978-985-553-598-1.

**УДК 811.161.3(075.3-056.3)**
**ББК 81.411.3я721**

**ISBN 978-985-553-598-1 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-553-594-3**

© Ляшчынская Т. Л., Аніскевіч С. С., 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2019

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СЛОВА

## Словы — дзеянні прадметаў

### *Урок 1*

**1.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што робяць дзеці. Складзіце да малюнкаў сказы з двух слоў.



Узор. *Алеся* (што робіць?) *малюе*.

Словы для даведкі: *малюе, танцуе, спявае, майструе*.

Словы — дзеянні прадметаў адказваюць на пытанні што робіць? што робяць? што рабіў? і іншыя. *Саджае, накрываюць, палівай, свеціць, цячэ*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Прачытайце сказы. Спішыце іх. Падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанне *ш т о  р о б і ц ь?*

1. Піяніст іграе. 2. Швачка шые. 3. Трактарыст арэ. 4. Мастак малюе. 5. Артыст выступае. 6. Самалёт ляціць. 7. Дрэва расце.

**3.** Гаварыце і паказвайце дзеянні.

Прачынаюся я рана (д з е ц і  п а ц я г в а ю ц ц а).
Мыюся вадой з-пад крана (м ы ю ц ь  т в а р).
Я расчоскай прычэсваюся (п р ы ч э с в а ю ц ц а).
У люстэрка я гляджуся (г л я д з я ц ц а  ў  р у к у-л ю с т э р к а).

**4.** Праслухайце. Раскажыце пра Паўліка і Міколку. Як яны сябруюць?

У брацікаў Паўліка і Міколкі прозвішча Ганчар. Хлопчыкі ўсё робяць разам. **Брацікі разам гуляюць, разам ядуць.** Ім усяго па чатыры гады. Яны любяць адзін аднаго. Паўлік спатыкнецца і заплача. Міколка таксама плача:

— У Паўліка ножка баліць!

Запішыце ў сшытак імёны брацікаў і іх прозвішча.

Спішыце выдзелены сказ. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, дзвюма лініямі.

Раскажыце пра сваіх братоў і сясцёр. Як вы сябруеце з імі? Як дапамагаеце адно аднаму?

Запішыце сваё прозвішча і імёны сваіх братоў і сясцёр.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Паразмаўляем

**5.** Пазнаёмце таварыша са сваім братам або са сваёй сястрой па ўзоры.

У з о р.

Віця прыйшоў у госці да свайго сябра з братам.

— Алесь, пазнаёмся. Гэта мой брат Міколка.

— Міколка, я Алесь. Праходзьце, калі ласка. Гэта мая сястра Ганначка. А як завуць тваю сястру?

— У мяне няма сястры.

### *Урок 2*

**6.** Разгледзьце малюнкі.

1. Што дзеці лепяць са снегу?
2. Хто едзе з гары на санках?
3. Што робіць хлопчык?
4. Што робіць дзяўчынка?









Складзіце сказы. Запішыце іх. Падкрэсліце словы — дзеянні прадметаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Спішыце сказы з левага слупка. Замест кропак устаўце ў іх словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| 1. Тата ... кніжку. | палівае |
| 2. Зося ... кветкі. | чытае |
| 3. Валодзя ... задачу. | прыбірае |
| 4. Вольга ... пакой. | рашае |

**8.** Спішыце сказы. Устаўце прапушчаныя словы. Якое пытанне вы паставіце да гэтых слоў? Падкрэсліце словы — дзеянні прадметаў.

Наташа ... рана. Яна ... да акна. Наташа ... на дарогу. Сёння яна ... ў вёску.

Словы для даведкі: *глядзіць, паедзе, ідзе, устае.*

***9.** Прачытайце.

Узор. *Увайсці — выйсці.*

Сесці — ... .
Зачыніць — ... .
Даць — ... .
Спытаць — ... .

Пакажыце ў пары дзеянне і адваротнае дзеянне. Запішыце назвы двух дзеянняў у сшытак.

Словы для даведкі: *адчыніць, устаць, узяць, адказаць.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**10.** Прачытайце верш. Выпішыце словы — дзеянні прадмета (алоўка).

**Крыўда алоўка**

Я заўсёды вам служу:
і рашаю, і пішу,
усё, што хочаш,
я змайструю,
на паперы намалюю.
Дык чаму, скажыце мне,
хваляць вас, а не мяне?

*А. Клышка*

## *Урок 3*

**11.** Слухайце і паказвайце.

***

Сняжыначкі, пушыначкі
як матылькі ляцелі...

Насіліся, кружыліся
над ціхімі палямі.

Сцяжыначкі, даліначкі
пакрылі дыванамі.

*З. Бядуля*

Што рабілі сняжынкі?

Запішыце сказ. Падкрэсліце дзвюма лініямі словы — дзеянні прадметаў.

Сняжыначкі ляцелі, насіліся, кружыліся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***12.** Да слоў — назваў прадметаў падбярыце словы — дзеянні прадметаў.

Узор. *Повар гатуе абед.*

Повар ... абед. Швачка ... адзенне. Будаўнік ... дом. Выхавальнік ... дзяцей. Паштальён ... пошту.

Словы для даведкі: *гатуе, будуе, шые, разносіць, выхоўвае.*

**13.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Пакажыце адгадкі на малюнках. Назавіце ў загадках словы — дзеянні прадметаў.



1. Хто пад мосцікам віляе хвосцікам?



2. Клубок паўзе, іголкі вязе.

Запішыце загадкі ў сшытак. Падкрэсліце словы — дзеянні прадметаў дзвюма лініямі.

**14.** Да слоў — назваў прадметаў падбярыце словы — дзеянні прадметаў. Запішыце ў сшытак сказы, якія атрымаліся.

Вада ... . Лес ... . Варона ... . Сабака ... . Карабель ... . Чалавек ... .

Словы для даведкі: *каркае, цячэ, плыве, шуміць, ідзе, брэша.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**15.** Выканайце просьбы.

Выйдзі з класа — увайдзі ў клас.
Завяжы шнуркі — развяжы шнуркі.
Адчыні дзверы — зачыні дзверы.
Уключы святло — выключы святло.
Адкруці кран — закруці кран.

Спішыце пары слоў, што абазначаюць дзеянні.

Узор. *Выйдзі — увайдзі.*

## *Урок 4*

**16.** Прачытайце сказы. Спішыце іх. Падкрэсліце дзвюма лініямі словы, якія адказваюць на пытанне што робіць?

1. Дзіця спіць. 2. Хлопчык піша. 3. Ніна чытае. 4. Маці ідзе. 5. Бабуля расказвае. 6. Дзяўчынка вяжа.



### Паразмаўляем

**17.** Прачытайце.

— Дзе ты быў учора?
— У Батанічным садзе.
— Табе спадабалася?
— Вельмі спадабалася! Там такія прыгожыя кветкі!

Спішыце два апошнія сказы. Падкрэсліце клічнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***18.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх лішнія словы. Запішыце правільныя сказы ў сшытак па ўзоры.

У з о р. *Варона дзеўбанулаката.*

Варона дзеўбанула ката дзюбай. Маша пасаліла суп соллю. Хлопчык шаптаў шэптам. Каця намалявала на малюнку ружы.

**19.** Запішыце сказы ў сшытак, выбіраючы патрэбныя словы. Вусна пастаўце да іх пытанні.

Хлопчык ... галубоў. Дзяўчынка ... кветку. Бабуля ... бялізну. Дзядуля ... газету.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *чытае, прасуе, вышывае, корміць.*



## Хвілінка-весялінка

**20.** Праслухайце.

Антось спытаў у касіра:
— Колькі каштуе білет у цырк?
Касір адказала.
— Але ў мяне няма столькі грошай. Ёсць толькі палова.
— Папрасі ў мамы.
— Мамы няма дома. Прапусціце мяне. Я буду глядзець не двума вачыма, а адным вокам.

Які быў хлопчык: знаходлівы, хітры ці неразумны?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 5*

**21.** Да слоў левага слупка падбярыце словы з права-га слупка. Запішыце ў сшытак сказы, якія атрымаліся.

| | |
|---|---|
| Маланка | ідзе |
| Дождж | свеціць |
| Сонца | грыміць |
| Гром | бліскае |
| Лес | шуміць |

***22.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад імі. Пакажыце рухамі дзеянні.



Маляр фарбуе сцяну.



Муляр робіць кладку сцяны.



Тынкоўшчык пакрывае сцяну тынкам.

Пісьмова адкажыце на пытанні.
Што робіць маляр?
Што робіць тынкоўшчык?
Што робіць муляр?

Чым адрозніваюцца словы *маляр* і *муляр* у напісанні? Чым яны адрозніваюцца па значэнні?

! **Тынк** — *на рускай мове* штукатурка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**23.** Спішыце. Замест кропак дапішыце словы, якія абазначаюць дзеянні.

Сабака … . Зязюля … . Курыца … . Кот … . Рыба … . Птушка … .

Словы для даведкі: *кукуе, гаўкае, кудахча, плавае, мяўкае, шчабеча.*

**24.** Пакажыце, дзе хлопчык апранаецца, а дзе яго апранаюць.





Пакажыце, як вы будзеце апранаць і распранаць малодшых брацiка або сястрычку.



**Хвілінка-весялінка**

**25.** Прачытайце.

**Кот-рыбак**

Асцярожна з-пад варот
выбег з вудай чорны кот.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ты куды? — спытаў бычок.
— Па маліны ў сасначок.
— Прынясі лясной мне праўкі,
не парві аб галлё плаўкі!

*Н. Галіноўская*

Куды пабег кот? Чаму вы так думаеце?

## *Урок 6*

**26.** Прачытайце. Дапоўніце і запішыце ў сшытак сказы.

1. Будуе школу. Гэта ... .
2. Возіць грузы. Гэта ... .
3. Працуе на камбайне. Гэта ... .
4. Працуе на трактары. Гэта ... .
5. Варыць супы, кашы. Гэта ... .
6. Вучыць дзяцей. Гэта ... .

Словы для даведкі: *настаўнік, повар, трактарыст, будаўнік, камбайнер, шафёр.*

**27.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

***

Маленькія лапкі,
на лапках драпкі,
ціхенька ступае,
мышак пужае. (Кот)

*З народнага*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***

Маленькі шарык
пад лаўкай шарыць,
збірае крошкі,
баіцца кошкі. (ɯıdM)

*Н. Гілевіч*

Адгадкі прачытайце з дапамогай люстэрка.

Складзіце два сказы са словамі-адгадкамі. Запішыце іх у сшытак. Падкрэсліце словы — дзеянні прадметаў.

**28.** Да слоў першага радка падбярыце словы з другога радка. Запішыце пары слоў у сшытак.

Узор. *Кветкі цвітуць.*

Кветкі, курыца, птушкі, мядзведзь.
Спяваюць, цвітуць, спіць, кудахча.

**29.** Замест кропак устаўце словы — дзеянні прадметаў.

Вучні (што робяць?) ... .
Швачкі (што робяць?) ... .
Маляры (што робяць?) ... .
Будаўнікі (што робяць?) ... .

Словы для даведкі: *чытаюць, шыюць, фарбуюць, будуюць.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Хвілінка-весялінка

**30.** Праслухайце.

— Тата, — пытае сын. — Хто з нас старэйшы, кот ці я?
— Вядома, ты.
— А чаму кот з вусамі, а я без вусаў?



Адкажыце на пытанне хлопчыка.

*Урок 7*

***31.** Прачытайце. Вызначце тэму тэксту. Раскажыце тэкст з дапамогай малюнка.

### Цімка і вожык

Сабака Цімка гуляў у двары. Ён быў мяккі, пушысты. Цімка ўбачыў вожыка. Сабака дакрануўся да вожыка лапай. Вожык быў калючы. Цімка збег ад вожыка.

Запішыце ў сшытак адказы на пытанні.
Хто гуляў у двары?
Які быў Цімка?
Каго ўбачыў Цімка?
Які быў вожык?
Што зрабіў Цімка?



Раскажыце, чаму Цімка не стаў сябраваць з вожыкам.
З кім вы сябруеце? Раскажыце пра свайго сябра.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**32.** Назавіце прадметы па дзеяннях.

1. Лятае, гудзе, джаліць (х т о?) ... .
2. Бегае, брэша, сцеражэ (х т о?) ... .
3. Па́дае, ззяе, растае (ш т о?) ... .

Спішыце сказы. Замест кропак устаўце патрэбныя словы.

С л о в ы д л я д а в е д к і: *сабака, снег, пчала*.

**33.** Спішыце верш у сшытак. Падкрэсліце словы, якія адказваюць на пытанне ш т о р о б я ц ь?

І пякуць мяне,
і вараць,
і ядуць мяне,
і хваляць.
На зіму запасаюць,
бульбачкай называюць.

Якія стравы можна прыгатаваць з бульбы?

**34.** Разгледзьце малюнкі на старонцы 17. Прачытайце подпісы пад імі.

Прачытайце сказы пра Вераніку і Алесю. Устаўляйце ў сказы патрэбныя імёны.

Маці памыла бялізну. ... дапамагае маме.
Хутка ў мамы дзень нараджэння. ... вышывае кветку.

Запішыце сказы пра адну з дзяўчынак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Вераніка прасуе.



Алеся вышывае.

Пакажыце дзеянні: як прасуюць і як вышываюць.



**Паразмаўляем**

**35.** Пакажыце дзеянні ў пары. Скажыце, што вы з прыемнасцю зробіце тое, пра што просіць маці.

Узор.
— Калі ласка, налі́ малака.
— Я зраблю гэта з прыемнасцю.

1. Налі малака.
2. Праветры пакой.
3. Уключы тэлевізар.
4. Палі́ кветкі.
5. Падай, калі ласка, акуляры.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 8*

**36.** Прачытайце.

  

***

Мама вяжа
рукавічкі.
Я ваксую
чаравічкі.

А на кухні
дзед з бабуляй
мыюць міскі
і каструлі...

*М. Хамянкоў*

Адкажыце пісьмова на пытанні па тэксце і малюнках.
Што робіць мама?
Што робіць хлопчык?
Што робяць дзядуля і бабуля?

**37.** Раскажыце, што вы робіце дома. Якія вашы абавязкі? Запішыце ў сшытак адказы.

Словы для даведкі: *прыбіраю, складаю, засцілаю, паліваю.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**38.** Дапішыце сказы. Падбярыце адпаведныя словы — дзеянні прадметаў.

Узор. *Машыніст водзіць цеплавозы.*

1. Машыніст ... цеплавозы. 2. Шавец ... абутак. 3. Ляснік ... лес. 4. Пчаляр ... пчол. 5. Настаўнік ... дзяцей.

Скажыце і пакажыце, як працуюць людзі.

Словы для даведкі: *водзіць, шые, даглядае, вучыць, разводзіць.*

**39.** Прачытайце сказы. Пакажыце, да якіх малюнкаў яны падыходзяць.







1. Рыба плыве.
2. Таксі едзе.
3. Чарапаха паўзе.

Запішыце сказы. Падкрэсліце дзвюма лініямі словы — дзеянні прадметаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**40.** Праслухайце верш.

***

Верабей са школы
ціхі, невясёлы
пад страху ляціць,
нібы ліст, дрыжыць.
То смяшыў сароку,
то лятаў на ўроку.
Так хацеў забаў —
двойку атрымаў.

*М. Пазнякоў*

Пра каго напісаны гэты верш? Дайце яму назву. Запішыце загаловак у сшытак.

Чаму вучыць гэты верш?

Пісьмова адкажыце на пытанні.

Якую адзнаку атрымаў верабей на ўроку?

Чаму? Што ён рабіў на ўроку?

### *Урок 9*

**41.** Прачытайце.

Перад святам тата купіў торт. Мама адкрыла каробку. І Галя заплакала. Ёй не падабаўся маленькі вафельны торцік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Тады тата сказаў:

— Усе куплялі вялікія і з крэмам. А на гэты ніхто не звяртаў увагі. Я пашкадаваў яго і купіў.

Галя падняла вочы і выцерла слёзы. Яна таксама пашкадавала торцік.

А ён быў смачны. І Галі спадабаўся.

*Паводле В. Дранчука*

Пісьмова адкажыце на пытанні словамі з тэксту.

Што купіў тата?

Чаму заплакала Галя?

Чаму тата купіў маленькі торцік?

Чаму Галя перастала плакаць?

Які быў торцік?

**42.** Прачытайце.

**Лясная госця**

Дзеці павесілі на лясную госцю прыгожыя цацкі, цукеркі, яблыкі. Наверсе прымацавалі зорку. Але госця сумавала. Раней да яе прыбягалі заяц-бяляк, вавёрачка, ліса і іншыя звяры. Тады дзеці зрабілі маскі зайца, вавёркі і лісы.

*Паводле Р. Бензерука*

Пісьмова адкажыце на пытанні. Выкарыстайце словы — дзеянні прадметаў.

Што дзеці павесілі на лясную госцю?

Што прымацавалі наверсе?

Чаму госця сумавала? Што зрабілі дзеці?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**43.** Прачытайце, што адбылося далей.

Прыйшлі Дзед Мароз і Снягурка ў школу. Дзеці вадзілі карагод, спявалі песні, чыталі вершы каля лясной прыгажуні. Дзед Мароз раздаваў усім падарункі. Развесялілася лясная госця. Дзед Мароз са Снягуркай паабяцалі кожны Новы год прыходзіць да дзяцей у школу.

Вы здагадаліся ўжо, як завуць лясную госцю?

*Паводле Р. Бензерука*

Як завуць лясную госцю?

Хто прыйшоў да дзяцей у школу?

Што рабілі дзеці каля ёлкі? Што паабяцалі Дзед Мароз і Снягурка дзецям?

Выберыце назву тэксту: «Новы год», «Дзед Мароз і Снягурка», «Свята ў школе».

***44.** Прачытайце ліст хлопчыка з пажаданнямі да Дзеда Мароза.

**Дарагі Дзядуля Мароз!**

Я вучуся ў трэцім класе. Мяне завуць Дзяніска. Прозвішча Астапчык.

Падары, калі ласка, маёй маленькай сястрычцы вялікую прыгожую ляльку. А мне падары канструктар. Вялікі табе дзякуй.

Дзяніска

Складзіце ліст-пажаданне да Дзеда Мароза. Запішыце яго ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**45.** Прачытайце і адгадайце вершы-загадкі.

Нарадзілася ў лясочку,
сярод сосен у пясочку.
Я стаю цяпер у зале,
мяне дзеці прыбіралі...
Заўтра тут, як і штогод,
заспявае карагод.

*У. Мацвеенка*



Ёлка

Заўсёды, летам і зімой,
мае іголачкі са мной.
Галінак у мяне багата.
Зімой прыходжу
я на свята.

*В. Жуковіч*



Елка

Вывучыце на памяць загадку, якая вам больш спадабалася. Загадайце яе на свяце. Як называецца дрэва, якое прыходзіць да нас на Новы год?

## *Урок 10*

**46.** Прачытайце словы. Дапоўніце іх трэцім словам. Запішыце ў сшытак.

У з о р. *Пішу, чытаю, рашаю*.

Пішу, чытаю, ... . Стаю, іду, ... . Капаю, сею, ... . Складаю, выціраю, ... .

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *рашаю, саджаю, прыбіраю, е́ду*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**47.** Прачытайце.

Хлопчык пакрыўдзіў дзяўчынку. Яна плача. Што рабіць? Трэба папрасіць прабачэння:

— Прабач, калі ласка. Я больш не буду так рабіць!

Сказаць гэта трэба вельмі пяшчотна і шчыра. І тады дзяўчынка перастане плакаць.

*Паводле А. Бадака*

Пакажыце, як вы будзеце пяшчотна і шчыра прасіць у дзяўчынкі прабачэння.

***48.** Прачытайце. Якія дзеці: добрыя, спагадлівыя, абыякавыя?

Аса ўджаліла Варкоціка. У коціка забалеў жывоцік. Мама дала дзецям лекі. Яны будуць лячыць Варкоціка.



Прыдумайце загаловак да тэксту. Запішыце ў сшытак, што робяць дзеці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**49.** Праслухайце. Паспрабуйце разгарнуць цукерку ў шапаткой абгортцы. Гэта чутно ці не?

— Тата, а чаму цукеркі загортваюць у шапаткія абгорткі?

— Для таго, сынок, каб усе чулі, што наша Нюра нічога не есць, акрамя цукерак.

! **Шапатка́я абго́ртка** — абгортка, якая шамаціць.

***50.** Разгледзьце малюнкі. Знайдзіце ў подпісах памылкі. Выпраўце іх і запішыце ў сшытак сказы без памылак.



Яблыкі паспелі.



Хлопчык трымае гарбуз.



Сонейка свеціць.



У хлопчыка кавуны.



Трамвай едзе.



У Соні рэпа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Словы — назвы прымет прадметаў

### *Урок 11*

**51.** Разгледзьце малюнкі. Дапішыце патрэбныя словы з правага слупка ў сказы з левага слупка.







| | |
|---|---|
| Шар (я к і?) … . | круглае |
| Гадзіннік (я к і?) … . | круглы |
| Рэпа (я к а я?) … . | круглая |
| Кола (я к о е?) … . | круглы |
| Акуляры (я к і я?) … . | круглыя |

Словы — назвы прымет прадметаў адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я? *Дзень* (я к і?) ***цёплы,*** *пара́* (я к а я?) ***цёплая,*** *надвор'е* (я к о е?) ***цёплае,*** *дні* (я к і я?) ***цёплыя.***



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**52.** Разгледзьце малюнкі. Выканайце заданні.



Пакажыце рукой высокае дрэва і нізкае.
Пакажыце вялікі дом і малы.
Адкажыце на пытанні.

Якія мячы па велічыні?
Якія хлопчыкі па росце?
Якія дрэвы па таўшчыні?
Якія дрэвы па вышыні?
Якія дамы па велічыні?

Складзіце і запішыце сказы. Выберыце патрэбныя пары слоў.

Словы для даведкі: *тоўстае і тонкае, высокае і нізкае; вялікі і малы; высокі і нізкі; вялікі і высокі, маленькі і нізкі.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***53.** Выберыце патрэбныя словы і запішыце сказы ў сшытак.

| | |
|---|---|
| Лімон (я к і?) ... . | кіслы, салодкі |
| Мёд (я к і?) ... . | горкі, салодкі |
| Цыбуля (я к а я?) ... . | кіслая, горкая |
| Морква (я к а я?) ... . | салодкая, кіслая |

**54.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад імі. Пакажыце на малюнках Свету і Лізу. Падбярыце дзяўчынкам абутак пад колер сукенак.







Дзяўчынка
ў ружовай сукенцы.

Дзяўчынка
ў блакітнай сукенцы.

У Светы ружовая сукенка і (я к і я?) ... туфелькі.
У Лізы блакітная сукенка і (я к і я?) ... туфелькі.

Словы для даведкі: *чырвоныя, карычневыя, сінія, зялёныя*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**55.** Скажыце, што не можаце зрабіць тое, пра што вас просяць.

Узор.

— Дай мне, калі ласка, шклянку соку.

— Прабач, але ў мяне, на жаль, няма соку.

— Дай мне, калі ласка, цукерку (шакаладку).

— На жаль, яе ўжо няма. Мы цукерку (шакаладку) з'елі ўчора.

## *Урок 12*

**56.** Паслухайце пра свята «Гуканне вясны». Словы гукання вясны вымаўляйце ўсе разам.

**Мы вясну гукаем**

Мы вясну гукаем,
мы вясну чакаем,
прыходзь, вясна!
З ручайком бурлівым,
з рэчкай гаманлівай
прыходзь, вясна!
З песняю-вяснянкай,
з сонейкам уранку
прыходзь, вясна!

*З народнага*

З якім ручайком прыходзіць вясна?
З якой рэчкай яна прыходзіць? Чаму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Запішыце ў сшытак словы — назвы прымет ручайка і рэчкі. Напішыце іншыя прыметы вясны.

Луг які? … .
Сонейка якое? … .
Траўка якая?… .
Лісточкі на дрэвах якія? … .

Словы для даведкі: *яркае, зялёненькая, гаманлівыя, зялёны.*

***57.** Прачытайце.

**Два пеўнікі**

Два **маладыя** пеўнікі пасварыліся і пабіліся. Адзін пеўнік перамог. Ён узляцеў на дах **высокай** хаты і закрычаў: ку-ка-рэку! Пеўніка пачуў **хуткі** ястраб. Ён прыляцеў, схапіў і панёс **крыклівага** пеўня. Нядобра сварыцца і хваліцца.

*Паводле К. Ушынскага*

Што здарылася з маладымі пеўнікамі?
Як паводзіў сябе пеўнік, які перамог?
Пакажыце, як крычаў певень-пераможца. Перадайце пачуццё гонару.
Што зрабіў хуткі ястраб?
Чаму вучыць тэкст? Прачытайце апошні сказ.
Выпішыце з тэксту выдзеленыя словы. Складзіце вусна з імі сказы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**58.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Вам дапамогуць малюнкі.

**Загадкі**

1. Чырвоны, ды не яблык.
Круглы, ды не мяч.
Смачны, ды не апельсін.



2. Як сустрэнешся ты з ёю,
вочы поўняцца слязою.
Носіць жоўтую кашулю.
Загадка гэта пра ... .



Назавіце ў загадках словы — назвы прымет прадметаў.

Складзіце і запішыце ў сшытак сказы са словамі-адгадкамі. Ужывайце словы, якія называюць прыметы прадметаў.

***59.** Прачытайце. На якія прыметы прадметаў указваюць наступныя словы?

Круглы, зялёны, вялікі, жалезны, прадаўгаватыя, жоўты, малы, драўляны, трохвугольны.

Запішыце словы ў такім парадку:

1. Форма: круглы, ... .
2. Колер: зялёны, ... .
3. Велічыня: вялікі, ... .
4. Матэрыял: жалезны, ... .

Дадайце свае прыклады і запішыце іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Хвілінка-весялінка

**60.** Паслухайце верш. Разгледзьце малюнак. Ці здагадаліся вы, што такое бярозавая каша? За што яе даюць дзецям? Выберыце: дзеці гуляюць, дурэюць, сваволяць ці працуюць.



### Бабіны госці

— Ладачкі-ладкі,
дзе былі? — У бабкі.
— Што пілі вы? — Малако.
— А што елі? — Ко-ко-ко.
— Доўга ж вы сядзелі,
доўга пілі, елі.
— А мы не сядзелі —
цэлы дзень дурэлі.
Мы і заўтра пойдзем
да бабулі нашай —
абяцала бабка
бярозавай кашы.

*В. Вітка*



Чым бабуля карміла ўнукаў? Якія гэтыя прадметы па колеры і па форме?

Словы для даведкі: *ко-ко-ко — яйкі прадаўгаватыя па форме; малако — белага колеру.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 13*

**61.** Назавіце намаляваныя прадметы. Якія яны па колеры? Запішыце назвы і прыметы прадметаў.



Словы для даведкі: *зялёны, чырвоны, белыя, сінія, аранжавы, жоўты; сланечнік, агурок, яблык, апельсін, кветкі, валошкі.*

**62.** Паслухайце тэкст.

Коля ўзяў у школу смачны бутэрброд. У суседа па парце Віці таксама ляжаў у партфелі смачны бутэрброд. Шкада Колю свой бутэрброд есці. Вось ён і кажа Віцю:

— Давай сёння з’ямо твой бутэрброд, а заўтра я з табой падзялюся.

Віця таксама пашкадаваў свой бутэрброд і кажа:

— Я так спяшаўся ў школу, што забыў бутэрброд дома.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ішлі ўрокі. Вельмі хацелася хлопчыкам есці. Але нічога не зробіш — давялося бутэрброды дамоў несці.

*Паводле А. Дыбчы*

Чаму хлопчыкі засталіся галоднымі?
Якімі яны былі: шчодрымі ці скнарлівымі, скупымі?
Чаму вучыць гэты тэкст?

***63.** Міколка прыйшоў са школы і знайшоў на стале запіску. Прачытайце яе.

Міколка! Мама прасіла схадзіць у магазін і купіць хлеб, крупы, масла, пасту.

Сястра Алена

Ці здолее Міколка выканаць даручэнне маці? Якіх слоў не напісала сястра? Чаму неабходна было напісаць словы — назвы прымет прадметаў?
Напішыце, што патрэбна купіць.

Словы для даведкі: *белы, чорны хлеб; грэцкія, манныя, рысавыя крупы; сметанковае масла, сланечнікавы алей; зубная паста, таматная паста.*

**64.** Устаўце ў левы слупок патрэбныя словы з правага слупка. Запішыце сказы ў сшытак.

| | |
|---|---|
| Жоўтая, прадаўгаватая … . | яблык |
| Доўгі, зялёны … . | груша |
| Круглы, зялёны … . | агурок |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Хвілінка-весялінка

**65.** Прачытайце верш. Якое пачуццё ён у вас выклікае?

### Проса

Свежай кашай з проса
нас частуе Прося.
Каша надта смачная.
Просі ўсе мы ўдзячныя.

*М. Пазнякоў*

Назавіце ў вершы словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

Запішыце ў сшытак першы сказ верша.

## *Урок 14*

**66.** Маці паказвае фотаздымак сына і расказвае пра яго. Паглядзіце на фотаздымак і дапамажыце закончыць сказы.



У майго сына ... вочы, ... шчочкі. У яго ... валасы.

Запішыце сказы ў сшытак. Устаўце патрэбныя словы.

Словы для даведкі: *блакітныя, ружовыя, светлыя*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**67.** Прачытайце кожны сказ па два разы. Пакажыце рухамі, што напісана. Запішыце ў сшытак сказы, якія запомнілі.

На небе — цёмная хмара. Пайшоў моцны дождж. Было холадна. Дома пілі гарачы чай.

Сказы для даведкі: *На небе цёмная хмара* (указальны жэст на неба). *Пайшоў моцны дождж* (пальцы барабаняць па парце). *Было холадна* (рукі абдымаюць тулава). *Дома пілі гарачы чай* (напаўсагнутыя пальцы правай рукі падносяцца да вуснаў).

**68.** Прачытайце. Назавіце словы — назвы прымет месяцаў.

Сухі сакавік, цёплы красавік, мокры май — будзе добры ўраджай.

Вывучыце прыказку на памяць.

***69.** Прачытайце. Колькі ў вас сяброў?

**Сябры**

У мяне сяброў, прызнацца,
столькі ж, колькі маю пальцаў:
роўна дзесяць.
Гэта Валя,
Вераніка і Аксана,
Света, Паўлік, Ігар, Галя,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Анжаліка, Вадзік, Таня.
Але будзе яшчэ болей,
як вучыцца стану ў школе.
*М. Пазнякоў*

Раскажыце пра свайго сябра ці пра сваю сяброўку. Назавіце яго імя. Запішыце ў сшытак, які ён ці якая яна.

План:
1. Рост.
2. Колер валасоў.
3. Колер вачэй.
4. Які ці якая па характары.

Словы для даведкі: *светлы, цёмны; ветлівы, ветлівая; добры, добрая; высокі, нізкі; блакітны, чорны.*

**70.** Прачытайце і адгадайце загадку.

У агародзе на кусце
вісяць мячыкі на хвасце.
Нагадваюць чырвоныя зоры
смачныя … .

Спішыце загадку разам з адгадкай. Падкрэсліце словы — назвы прымет прадметаў.

Выберыце правільную адгадку: *вішні, памідоры, агуркі*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 15*

***71.** Прачытайце сказы. Устаўце замест кропак словы, якія называюць прыметы прадметаў. Падкрэсліце ўстаўленыя словы хвалістай лініяй. Пастаўце пытанні па ўзоры.

Узор. *Зімой у зайца футра* (якое?) *белае, а летам* (якое?) *шэрае.*

1. У студзені ў нас былі канікулы ..., а ў чэрвені пачнуцца канікулы ... . 2. Вясной лісце ..., а увосень ... . 3. Летам ночы ..., а зімой ... .

Словы для даведкі: *кароткія, доўгія, зімовыя, зялёнае, жоўтае, летнія.*

**72.** Спішыце. Устаўце замест кропак словы, якія называюць прыметы прадметаў. Вам дапамогуць малюнкі.

1. Шэры, баязлівы ... .
2. Круглы, гумавы ... .
3. Высокі, цагляны ... .
4. Рыжая, працавітая ... .
5. Зялёная, густая ... .









Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**73.** Разгледзьце малюнкі і адкажыце на пытанні. Запішыце адказы ў сшытак.



| | |
|---|---|
| Вецер (я к і?) … . | доўгая, кароткая |
| Машына (я к а я?) … . | цёмныя, светлыя |
| Сукенка (я к а я?) … . | легкавая, грузавая |
| Косы (я к і я?) … . | моцны, слабы |

**74.** Прачытайце.

Мы жывём у Беларусі. Тут нарадзіліся мама і тата. Тут жывуць мае бабулі і дзядулі.

Сталіца Беларусі — Мінск. Гэта вялікі і прыгожы горад. Вясной і летам ён зялёны. У нашым горадзе прыгожыя паркі і скверы. Запрашаем да нас у госці! Прыязджайце, не пашкадуеце!

Выпішыце тры сказы, у якіх ёсць словы, што называюць прыметы прадметаў.

Запрасіце прыехаць да вас у госці (вусна).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**75.** Прачытайце.

***

На зямлі ёсць куточак прыгожы —
як кляновы лісток, ён ляжыць.
Мірна, ціха прылёг на планеце
і спакойныя сны свае сніць...

Беларуссю завецца Радзіма,
белай-белай, як бэз або снег.
Ганаруся табою, Айчына,
і люблю ўсім сэрцам навек.

*А. Тамашэвіч*

***

Новы дзень над шумнай ніваю
запаліў ужо зару.
Дык жыві свабоднай і шчасліваю,
дарагая Беларусь!

*А. Бадак*

Знайдзіце і выпішыце з вершаў словы — назвы прымет прадметаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ГУКІ І ЛІТАРЫ

*Урок 16*

## Вылучэнне гукаў са слоў

**76.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце прадметы парамі. Якімі гукамі яны адрозніваюцца?



Мак



Кот



Зубы



Рак



Рот



Дубы

**Запішыце ў сшытак пары слоў. Падкрэсліце літары, якімі словы адрозніваюцца.**

Узор. *Рак — мак.*

Словы складаюцца з гукаў мовы. Гукі мы чуем і вымаўляем.

Гукі на пісьме абазначаюцца літарамі. Літары мы бачым і пішам. *Сад — сады.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**77.** Утварыце словы. Якімі гукамі яны адрозніваюцца? Запішыце словы. Падкрэсліце літары гукаў, якімі гэтыя словы адрозніваюцца.







**78.** Пакажыце на малюнках машыну, футра, сыр, ландышы, ружу. Назавіце першыя гукі ў гэтых словах.











Запішыце словы ў сшытак. Падкрэсліце літары першых гукаў гэтых слоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**79.** Прачытайце.

1. Белы бусел баіў байку беламу зайку.
2. Куры клююць крупы каля ступы.

Назавіце гукі, якія часта сустракаюцца ў словах гэтых сказаў.

! **Сту́па** — драўляная або металічная пасудзіна, у якой таўкуць што-небудзь таўкачом.



## Хвілінка-весялінка

**80.** Праслухайце.

### З мылам

— Ганка, Ганулячка,
ты яблыкі **мыла**?
— Мыла, бабуля,
ды нават і з **мылам**.

— Яблыкі мылам
не мыюць, унучка.
— Дзіўна, бабуля,
я ж мыю ім ручкі.

*А. Дзержынскі*

Якім гукам адрозніваюцца выдзеленыя словы?
Пакажыце, як вы будзеце мыць яблыкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 17*

## Гука-літарны аналіз слоў

**81.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце прадметы. Вызначце першы гук у кожным слове. Запішыце яго літару ў сшытак.



Узор. *Жук — ж, ... .*

Словы для даведкі: *жук, пчала, камар, муха.*

***82.** Прачытайце.

### Каша
(Скорагаворка)

Згатавала Саша
кашу для Машы.
Маша Сашы
ўдзячная —
каша ў Сашы
смачная.

*М. Пазнякоў*

Якімі гукамі адрозніваюцца імёны дзяўчынак? Запішыце ў сшытак гэтыя імёны. Падкрэсліце літары гукаў, якімі імёны адрозніваюцца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Да дадзеных імён падбярыце імёны, якія адрозніваюцца адным гукам і адной літарай.

Толя — … . Тоня — … . Воля — … .

Запішыце адказ на пытанне: якая каша ў Сашы? Падкрэсліце слова, якое называе прымету прадмета.

Словы для даведкі: *Валя, Таня, Коля.*

**83.** Назавіце прадметы на малюнках. Вымавіце першы і апошні гук кожнай назвы. Запішыце першую і апошнюю літары слоў — назваў прадметаў.



Узор. *1. К — с, … .*

Словы для даведкі: *кактус, чайнік, душ, заяц, вавёрка, рыдлёўка, нажоўка.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**84.** Разгледзьце малюнак.



Пакажыце на малюнку, дзе куток, а дзе каток.
Скажам выразна разам.

**Каток** закаціў клубок **у куток.**

Запішыце сказ у сшытак.

Якім гукам адрозніваюцца выдзеленыя словы? Падкрэсліце літары гэтых гукаў.



## Хвілінка-весялінка

**85.** Паслухайце.

Сына курачка вучыла,
палічыць гарох прасіла.
Пеўнік той гарошак з'еў:
ён вучыцца не хацеў.

*Л. Саўчук*

Раскажыце, чаму пеўнік не палічыў гарох.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 18*

## Галосныя гукі і іх літары

**86.** Лавіце мяч і паўтарайце той гук, які пачуеце. Пасля выразнага вымаўлення кі́дайце мяч назад і называйце свой гук.

**А, О, У, Э, Ы, І.**

Гукі, якія ўтвараюцца пры дапамозе толькі голасу, называюцца **галоснымі.**

Галосных гукаў у беларускай мове ш э с ц ь: ***а, о, у, э, ы, і***.

На пісьме галосныя гукі абазначаюцца літарамі: ***а, о, у, э, ы, і, е, ё, ю, я***. Гэтых літар д з е с я ц ь.

**87.** Разгледзьце малюнкі. Хто на іх адлюстраваны? Запішыце словы ў сшытак. Устаўце прапушчаныя літары. Якія гукі яны абазначаюць?






С..ва, л..са, г..сь, сл..н — гэта ... .

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *жывёлы, ліса, сава, слон, гусь*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**88.** Разгледзьце малюнкі. Спішыце подпісы пад імі. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце іх. Якія гукі яны абазначаюць?



К..т



К..т



Д..м



Д..м



С..н



С..н

***89.** Прачытайце словы. Назавіце ў іх гукі, якія можна праспяваць.

Запішыце словы ў сшытак. Падкрэсліце літары гэтых гукаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У з о р. *Л<u>о</u>дк<u>а</u> — о, а, ... .*

Лодка, мак, жук, кот, кіт, сыр.

Складзіце і запішыце два сказы са словамі *сыр* і *кіт*.



**Хвілінка-весялінка**

**90.** Прачытайце.

**Хітры зуб**

Ой, баліць у мяне зуб,
бо не хоча есці суп.
Хоча мёду,
хоча грушку,
хоча цёплую пампушку.
Як дасце ж яшчэ смятаны,
ураз балець ён перастане.

*У. Ладыжац*

Хто хітры: зуб ці дзіця, якое не хоча есці суп?

*Урок 19*

## Галосныя гукі і іх літары

**91.** Прачытайце словы. Якія галосныя гукі абазначаюць выдзеленыя літары?

П<u>а́</u>лк<u>і</u>, р<u>у</u>к<u>а</u>, н<u>а</u>г<u>а</u>, сш<u>ы</u>т<u>а</u>к, кн<u>і</u>жк<u>а</u>.

Запішыце словы ў сшытак.

У з о р. *П<u>а́</u>лк<u>і</u> — а, і, ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**92.** Прачытайце словы. Якія літары галосных гукаў паўтараюцца ў кожным радку? Запішыце іх у сшытак. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары?

Узор. *1. Луг — у, ... .*

Луг, лужа, лупа, луста.
Ліса, лімон, піла, ліпа.

***93.** Прачытайце імёны. Назавіце тыя імёны, якія вам больш падабаюцца. Запішыце ў сшытак літары галосных гукаў, якія паўтараюцца ў кожным радку.

1. Ліда, Ніна, Мікола, Мілана.
2. Маша, Макар, Марфа, Саша.
3. Косцік, Нона, Вольга, Мірон.

**94.** Паслухайце верш.

— Каб не было ў свеце ***ы***, —
Сказалі хорам мышкі, —
Былі б мядзведзямі ўсе мы,
Нас дзеці б звалі «мішкі».

*В. Вітка*

Пачынаем гульню «Жывыя гукі». Вы будзеце гукамі ***м, ш, к, ы, і, а***.

Утварыце слова *мышка*. Як гэта слова пераўтварыць у слова *мішка*? (Гук ***ы*** садзіцца, а на ягонае месца становіцца гук ***і***.)

Запішыце словы *мышка* і *мішка* ў сшытак. Якімі літарамі гэтыя словы адрозніваюцца? Падкрэсліце іх.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**95.** Прачытайце.

— Сонечка, чаму ты сама не ідзеш, а сядзіш у мамы на руках?

— Я маме хлеб дапамагаю несці.

Што вы параіце Сонечцы?

*Урок 20*

## Зычныя гукі і іх літары

**96.** Вымавіце гукі, абазначаныя літарамі.

Б, в, г, д, к, п, т, м, с, л, х, р.

Прачытайце словы. Правільна вымаўляйце зычныя гукі.

Шыба — шына, вочы — ночы, шар, пар, жар.

Гукі, якія ўтвараюцца пры дапамозе голасу і шуму або толькі шуму, называюцца **зычнымі.** Зычныя гукі абазначаюцца літарамі: ***б, в, г, д, ж, з, й, к, л, м, н, п, р, с, т, ў, ф, х, ц, ч, ш.***

**97.** Прачытайце. Выразна вымаўляйце зычныя гукі ў кожным слове. Запішыце словы. Падкрэсліце літары зычных гукаў.

Школа, дрэва, рэчка, жук, камар, піла.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***98.** Разгледзьце малюнкі. Раскажыце, што можна есці, а што нельга. Выразна вымаўляйце зычныя гукі. Запішыце словы ў сшытак. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.




Словы для даведкі: *лісічкі, кефір, мухамор, кансервы, маліны, жалуды.*

**99.** Складзіце са слоў сказы і запішыце іх у сшытак. Падкрэсліце ў словах літару ***б***. Які гук яна абазначае?

1. Каля, дубы, вёскі, раслі.
2. Буслы, гнёзды, на, рабілі, дубах.

**100.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце пачатак кожнага сказа. Дапоўніце яго словамі замест малюнкаў. Які гук паўтараецца ва ўсіх назвах прадметаў?

Свету ўкусіла . У лесе расце .

У нары жыве .

Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце літару ***с***. Які гук (галосны ці зычны) абазначае гэта літара?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 21*

## Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі

**101.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад малюнкамі парамі.



Нос



Воз



Сыны



Нёс



Вёз



Сіні

Запішыце словы ў сшытак парамі. У якіх словах ***н, в, с*** вымаўляюцца цвёрда, у якіх — мякка?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Усе зычныя гукі падзяляюцца на цвёрдыя і мяккія: ***б — б’, в — в’, с — с’, л — л’*** і іншыя.

Мяккасць зычных на пісьме абазначаецца літарамі ***і, е, ё, ю, я,*** а таксама мяккім знакам ***(ь)***. *Цёплы, лімон, Люба, персік, апенькі.*

**102.** Прачытайце словы. Назавіце ў словах мяккія зычныя. Якая літара паказвае ў гэтых словах мяккасць зычнага гука?

Зіна, вучні, кветкі, настаўнік, апельсін, лімон.

Спішыце, падкрэсліце склады з літарай ***і*** па ўзоры.

Узор. *Зіна*, ...

***103.** Прачытайце і спішыце сказы. Падкрэсліце склады з літарамі ***і, е, ё, ю, я***. Як вымаўляюцца зычная гукі перад гэтымі літарамі?

1. Сёстры Лена і Вера любяць шакаладныя цукеркі.
2. Кашу з грэчкі зварыла бабуля Зіна ў печцы.

***104.** Праслухайце.

Міла і Ліза суніцы збіралі.
Імі браціка пачаставалі.

Прачытаем разам сказы і пакажам дзеянні рухамі.
Спішыце сказы. Падкрэсліце літару ***і*** ў словах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***105.** Прачытайце пары слоў.

Лук — люк, воз — вёз, мышка — міска, палёт — пілот, лодка — лёд, мяч — матч.

Узор. *Люк*, ... .

! **Лук** — зброя для пуску стрэл.

Спішыце словы з мяккімі зычнымі. Падкрэсліце літары, якія паказваюць мяккасць зычных гукаў.

*Урок 22*

## Напісанне літар *а, о, у, ы, э* пасля цвёрдых зычных

**106.** Прачытайце імёны. Спішыце той радок, у якім імёны вам больш падабаюцца. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць цвёрдасць зычных.

Узор. *Мікола*.

1. Мікола, Алесік, Галя, Віця, Алена, Вольга, Ганна, Ніна, Лёня.
2. Янка, Каця, Эдзік, Валодзя, Юрка, Вера, Васілёк, Таццяна.
3. Лявон, Міхась, Юля, Света, Ядзя, Зіна, Надзя, Ірына, Стасік.

Літары ***а, э, о, у, ы*** паказваюць, што папярэднія зычныя гукі з'яўляюцца цвёрдымі: *клас, вусы*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**107.** Прачытайце. Спішыце выдзеленыя сказы. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя.

## Сяброўкі

Галя і Вера — сяброўкі. Дзяўчынкі вучацца ў 3 «А» класе. Яны сябруюць ужо тры гады. **Галя і Вера жывуць у адным доме.** Ганна жыве на трэцім паверсе дома. Вера — на пятым. **Дзяўчынкі разам ходзяць у школу.**

З кім вы сябруеце?
Ці далёка жывяце ад сябра (сяброўкі)?

***108.** Прачытайце верш. Пра якую пару года ў ім расказваецца? Назавіце прыметы вясны.

## Вяснянка

Святлее гай заспаны.
Павесялеў снягір.
Фіялкамі запахлі
пад вербамі снягі.

Раўчук вядзе разору
аж за прырэчны луг.
Нацешыцца не скора
вяснянкаю жаўрук.

*А. Пісарык*

! **Вясня́нка** — вясновая песня.
**Разо́ра** — доўгая канава.

Спішыце другі слупок верша. Падкрэсліце ў словах літары, якія паказваюць цвёрдасць папярэдніх зычных гукаў.

Якіх птушак вы яшчэ ведаеце? Запішыце іх назвы ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**109.** Паслухайце. Пакажыце і назавіце кветкі на малюнках.

### Кветкі

Колькі кветак ля ракі!
Сінія, як вочкі,
незабудкі і браткі,
смолкі і званочкі.
І мядунка, і герань,
слёзкі, мята, кашка!
Сто букетаў назбіраць
тут за дзень няцяжка.



Кашка



Незабудкі



Мядунка



Слёзкі



Браткі



Смолкі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Паміж кветак у траве
не разгледзець Светку:
толькі бант на галаве
мільганецца зрэдку...

*Н. Гілевіч*

Выпішыце з верша назвы кветак. Падкрэсліце ў словах літары, якія паказваюць цвёрдасць папярэдніх зычных гукаў.

**110.** Праслухайце. Як вы адкажаце на пытанне настаўніцы? Назавіце цвёрдыя зычныя ў слове *канапа*.

— Вова, якія зычныя у слове «канапа»: цвёрдыя ці мяккія? — спытала настаўніца.

— Мяккія, — адказаў Вова. — Канапа цвёрдай не бывае.

*Урок 23*

## Абазначэнне мяккіх зычных гукаў на пісьме літарамі *і, е, ё, ю, я*

**111.** Прачытайце сказы. Якія зычныя гукі перад літарамі ***і, е, ё, ю, я***: мяккія ці цвёрдыя?

1. Сняданак ужо на стале. Алена яшчэ на канапе.
2. Усе вучні ў школе. Лявон і Маня на арэлях.

Спішыце сказы, падкрэсліце літары, якія паказваюць мяккасць папярэдніх зычных гукаў.

Узор. *Снядaнак.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Літары ***і, е, ё, ю, я*** паказваюць, што папярэднія зычныя гукі з'яўляюцца мяккімі (акрамя ***ў***): *лік*, *печ*, *клён*, *бляск*.

**112.** Прачытайце верш.

**Суботнік**

У двары суботнік сёння,
там Ларыса, Света, Тоня
вёдры ўзялі і лапаты,
памагаюць мамам, татам.
Лепш за ўсіх шчыруе Пеця —
ён зграбае ў кучу смецце.
А Ларыса разам з Светай
робяць клумбы, сеюць кветкі.
Ой, прыгожа будзе ўлетку!

*С. Бестава*

Хто з дзяцей працуе на суботніку? Запішыце іх імёны ў сшытак. Падкрэсліце літары, якія паказваюць мяккасць зычных гукаў.

Пісьмова адкажыце на пытанні.

Што робіць Пеця?

Што сеюць Ларыса і Света?

**113.** Прачытайце.

Гэта залацістыя лісічкі. Яны — сямейнікі. Лісічкі любяць расці разам. Знайшлі адін грыб — паблізу



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

шукайце другі, трэці. Бабуля называе лісічкі жоўтымі гузікамі.

Спішыце сказ пра бабулю ў сшытак. Падкрэсліце ў словах літары, якія паказваюць мяккасць папярэдніх зычных гукаў.

Ці ўмееце вы збіраць грыбы? Хто вас гэтаму навучыў?

Чаму бабуля называе лісічкі жоўтымі гузікамі?

Як любяць расці лісічкі? Раскажыце.

**114.** Прачытайце. Разгледзьце малюнкі.

### Ягады




З мамай я збіраў суніцы,
а з бабуляю — чарніцы,
ездзіў з татам у маліны,
а з дзядулем — у ажыны.




А сягоння мы з сястрыцай
пойдзем разам па брусніцы,
запрасілі сябрукі
нас назаўтра ў буякі.




З кожнай, кожнай ягадай
павітацца рады я.

*М. Пазнякоў*

Выпішыце назвы ягад. Падкрэсліце ў словах літары, якія паказваюць мяккасць зычных гукаў.

Якія ягады вы збіралі? З кім?

Якія ягады вам падабаюцца? Чаму? Пакажыце іх на малюнку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**115.** Параўнайце напісанне літар ***з — д — у***. Чым яны падобныя? Чым адрозніваюцца? Прапішыце літары ў паветры. Напішыце ў сшытак літары і словы.

*з—д—у у—з—д задача—удача—задумка*

*Урок 24*

## Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме мяккім знакам (*ь*)

**116.** Прачытайце пары слоў.

стол — столь рыс — рысь

Як вымаўляюцца зычныя ў канцы слоў злева? А як справа?

> Мяккасць зычных на канцы і ў сярэдзіне слоў абазначаецца, акрамя літар ***і, е, ё, ю, я, мяккім знакам (ь)***.
>
> Мяккі знак — літара, якая не абазначае гука. *Стась, канькі.*

**117.** Прачытайце верш. Намалюйце пальчыкам мяккі знак у паветры.

Намалюем мяккі знак
плаўна пальчыкам вось так.
Усе гукі ён змякчыць,
слова мякка прагучыць.

Выпішыце словы з мяккім знакам. Падкрэсліце яго.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***118.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце на малюнках карася, ліня, акуня.







Запішыце словы ў сшытак. Падкрэсліце мяккі знак. Якіх рыб вы яшчэ ведаеце?

**119.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце ў сшытак загадку разам з адгадкай. Падкрэсліце мяккі знак.



Маленькі шустранькі звярок,
рыжанькая шубка,
чорненькія вочкі,
востранькія зубкі.

**120.** Прачытайце сказы. Спішыце іх. Падкрэсліце літару, якая абазначае мяккія зычныя на канцы слоў.

Антось любіць лавіць рыбу. Ён можа доўга чакаць улову.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 25*

## Абазначэнне мяккасці зычных на пісьме мяккім знакам (ь)

**121.** Пакажыце і назавіце прадметы на малюнак.





Як назваць каня, лася і аленя адным словам? Запішыце гэта слова ў сшытак. Падкрэсліце мяккі знак.

***122.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце, дзе пляцень, сетка, плот (ён з жэрдак).





Прачытайце сказы. Што прапушчана ў словах? Да якіх сказаў зроблены малюнкі?

1. На пляцен.. лёг цен.. .
2. Кожны дзен.. каля плота гудзе авадзен.. .
3. Бац..ка купіў Юлі лял..ку.

Спішыце сказы ў сшытак. Устаўце прапушчаныя літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Паразмаўляем

**123.** Скажыце, чаго вы хочаце. Атрымайце ветлівую згоду.

У з о р.
— Я хачу піць.
— Калі ласка, папі соку.
— Я болей хачу вады.
— Мінеральная вада стаіць на стале.
— Дзякуй.

Скажыце, што хочаце запрасіць у госці сябра. Затым скажыце, што хочаце купіць булачку.

**124.** Прачытайце.



***

Раз, два, тры, чатыры,
кошку грамаце вучылі:
не чытаць, не пісаць,
а за мышкамі скакаць.

*З народнага*



Выпішыце ў сшытак словы з мяккім знакам.
Пакажыце кошку Нюшку па ўзоры на малюнку.
Паказвайце і паўтарайце:

У кошкі Нюшкі
маленькія вушкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**125.** Праслухайце.

Беларускі горад Гомель стаіць на рацэ Сож. Раней на неглыбокім мелкім месцы ракі стаяў чалавек. Ён крычаў:

— Го-о! Мель! — Го-о! Мель!

Вось і пайшла назва горада — Гомель.

Выпішыце ў сшытак словы з мяккім знакам. Падкрэсліце яго.

## *Урок 26*

### Літары і гукі *дз* і *дж*

***126.** Прачытайце словы ў першым радку. Прачытайце правіла пра гук ***дз***. Потым прачытайце словы ў другім радку. Прачытайце правіла пра гук ***дж***.

1. Студзень, тыдзень, хадзіць, сядзець.
2. Ураджай, дождж ык, хаджу, саджаць.

Як вымаўляецца гук ***дз***? Як вымаўляецца гук ***дж***? Што ў іх вымаўленні падобнага? А чым яно адрозніваецца?

***Дз*** вымаўляецца ў словах мякка і як адзін гук. На пісьме гэты гук абазначаецца дзвюма літарамі ***д*** і ***з***. ***Дзверы, Дзіна***.

***Дж*** вымаўляецца ў словах цвёрда і таксама як адзін гук. На пісьме гэты гук абазначаецца літарамі ***д*** і ***ж***. ***Джынсы, джала***.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**127.** Прачытайце.

Агароджа, Дзіна, джэм, дзірка, джэмпер, дзіця.

Выпішыце ў сшытак словы ў два слупкі па ўзоры.

| Узор. | **дж** | **дз** |
|---|---|---|
| | *агароджа* | *Дзіна* |

**128.** Прачытайце. Аб чым падумаў смоўж? Калі і чаму ён заплакаў?

***

Грымнуў гром
на буралом.
«Будзе дождж», —
падумаў смоўж.

Дождж зака́паў,
смоўж заплакаў:
— Шмат вады,
паўзці куды?

*У. Мацвеенка*

! **Смоўж** — слімак.

Выпішыце ў сшытак з верша словы з ***дз*** і ***дж***.

**129.** Прачытайце і адгадайце загадку.



***

Што за дзіўная палоска
засвяцілася над вёскай?
Мо маланка каснічкі́
вышывае для дачкі?
Гэй, дзяўчаткі-шчабятушкі,
можа, там і вашы стужкі?

*А. Пісарык*

! **Каснічкі́** — стужкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Папрасіце свае пальчыкі намаляваць вясёлку.

Для гэтага пальчыкі левай рукі прывітаюцца з пальчыкамі правай рукі па чарзе: «Добры дзень! Намалюй, калі ласка, вясёлку!» Пальчыкі правай рукі заківалі «галоўкамі»: «Згодны, згодны». Пальцы малююць вясёлку.

*Паводле Т. Шылько*

**130.** Вызначце парадак напісання літар у радку. Напішыце ў сшытак па ўзоры.

*Дз – дж Дж – дз дзеці джэм*

***Урок 27***

### Гукі і літары *д* — *дз*

**131.** Прачытайце. Змяніце словы па ўзоры.

Узор. *Вада — у вадзе.*

Сад — у ..., горад — у ... .

Гукі ***д* — *дз*** парныя па цвёрдасці і мяккасці.
Цвёрды гук ***д*** змяняецца на мяккі ***дз***:
1) перад літарамі ***і, е, ё, ю, я***,
2) перад мяккім ***в***,
3) перад мяккім знакам ***(ь)***.
Гэтая з'ява называецца дзеканнем.
*Буду — будзе, два — дзве.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**132.** Прачытайце. Змяніце словы ў дужках, як патрабуе сэнс.

Рыба плавае ў (вада).
Салавей жыве ў (гняздо).
Кветкі выраслі ў (сад),
а капуста — на (града).

Запішыце ў сшытак зменены тэкст. Дужкі апусціце.

***133.** Прачытайце прыказку.

Мы жывём у згодзе. Згода будуе. Нязгода руйнуе.

Чаму нязгода руйнуе?

Падбярыце карцінку або зрабіце малюнак і падпішыце: «Мы жывём у згодзе».

**134.** Гульня «Цягнік».

Хлопчыкі і дзяўчынкі становяцца адно за адным. Гэта — цягнік. Першы вучань — паравоз, астатнія — вагоны. Настаўніца падае знак, і цягнік пачынае рухацца. Спачатку павольна, пасля ўсё хутчэй і хутчэй. Настаўніца кажа: «Цягнік спыняецца на станцыі „Лес“». Дзеці спыняюцца. Настаўніца прапануе збіраць грыбы і ягады. (Дзеці паказваюць гэтыя дзеянні.) Пасля ўсе вяртаюцца да настаўніцы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Хлопчык:

Скрозь яны, чарніцы спелыя.
Гляньце — вось вядзерца цэлае!

Дзяўчынка:

Мне памог руплівы вожык —
Назбіралі поўны кошык!

Настаўніца: «Малайцы, дзеці, запрашаю ўсіх заняць свае месцы ў цягніку». Гульня працягваецца.

Наступная станцыя «Рэчка». (Дзеці загараюць, плаваюць, ловяць рыбу, паказваюць свае дзеянні.)



## Хвілінка-весялінка

**135.** Прачытайце. Што смешнага ў прапанове хлопчыка?

— Тата, давай гуляць у футбол, — кажа Віця.
— А як будзем гуляць? — пытаецца ў Віці тата.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Віця адказвае:
— Ты забірай у мяне мячык, а я буду плакаць.

*А. Альхімовіч*

Знайдзіце і запішыце словы, у якіх цвёрды гук ***д*** перайшоў у мяккі ***дз***.

*Урок 28*

## Гукі і літары *т* — *ц*

**136.** Прачытайце. Змяніце словы па ўзоры.

Узор. *Брат — брацік, ... .*

Кот — ..., торт — ... .

Гукі ***т*** — ***ц*** парныя па цвёрдасці і мяккасці.
Цвёрды гук ***т*** змяняецца на мяккі ***ц***:
1) перад літарамі ***і, е, ё, ю, я***;
2) перад мяккім знакам ***(ь)***.
Гэтая з'ява называецца цеканнем.
*Балота — на балоце, пяты — пяць.*

**137.** Змяніце словы па ўзоры.

Узор. *Плот — на плоце, ... .*

Жыта — у ..., пліта — на ..., газета — у ..., шахта — у ..., лета — аб ..., ракета — у ..., карта — на ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**138.** Прачытайце.

Ходзіць бусел па (балота),
жабы ловіць у (чарот).
Яны квакаюць, крычаць,
не даюць Ірынцы спаць.

Запішыце ў сшытак першы сказ. Апусціце дужкі. Змяніце словы ў дужках па сэнсе.

***139.** Прачытайце.

**Парашутыстка**

Зіма з нябёс спусцілася
на белых **парашуціках**.

За дрэвы зачапілася,
заблыталася ў **кусціках**.

*В. Карніцкая*

Выпішыце ў сшытак з тэксту выдзеленыя словы. Падкрэсліце літару, якая абазначае мяккі гук ***ц***. Змяніце словы, каб мяккі гук ***ц*** перайшоў у цвёрды гук. Падкрэсліце літару, якая яго абазначае. Запішыце словы, якія атрымаліся.



**Хвілінка-весялінка**

**140.** Прачытайце.

Вярнуўся дзядуля з работы. Унучка Света, як заўсёды, да яго:

— Што купіў?

— Нічагусенькі! — адказаў дзед Свеце.

— Чаму? — спыталася Света.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

— Ды нічога добрага не было ў магазіне.
— А што дрэннае было?

*М. Дзелянкоўскі*

А як вы сустракаеце родных, якія прыйшлі з работы дамоў? Пакажыце.

## *Урок 29*

### Зацвярдзелыя зычныя і літары *а, о, у, ы, э* пасля іх

**141.** Прачытайце верш А. Дзеружынскага. Спішыце. Падкрэсліце літары галосных пасля ***р, ш, ч***.

Прыгрэла сонейка
на ўзлеску,
птушыны спеў чуваць здаля...

Гукі ***ж, ш, дж, ч, р, ц*** — зацвярдзелыя і парных мяккіх не маюць.

Пасля іх пішуцца літары галосных гукаў ***а, о, у, ы, э***: *снежань*.

У беларускай мове ёсць і мяккі гук ***ц***: ***рот*** — *у роце*.

**142.** Падбярыце да слоў з левага слупка словы з правага, якія падыходзяць па сэнсе.

| | |
|---|---|
| ружа | чорны |
| лісіца | шэрая |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| грак | рыжая |
| чапля | чырвоная |

Запішыце ў сшытак спалучэнні слоў. Падкрэсліце зычныя ***ж, ш, дж, ч, р, ц*** разам з наступнымі літарамі галосных гукаў.

**143.** Прачытайце словы. Запішыце ў сшытак словы аднаго радка (на выбар).

Падкрэсліце літары гукаў, якія заўсёды з'яўляюцца цвёрдымі.

1. Суніцы, чарніцы, журавіны, агрэст.
2. Пшаніца, жыта, ячмень, грэчка.

Якая ягада для вас самая смачная? Складзіце і запішыце сказ з назвай гэтай ягады.

***144.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце яе разам з адгадкай.

На полі цёмным і бясконцым
гарох бялюткі ззяе.
А цемру як разгоніць сонца,
тады гарох знікае.

*М. Пазнякоў*

Падкрэсліце ў словах адной рыскай літару ***ц***, якая абазначае мяккі гук. Дзвюма рыскамі падкрэсліце літару ***ц***, якая абазначае цвёрды гук.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**145.** Прачытайце. Разгледзьце малюнак.



### Буслянка

Будуюць буслы буслянку.
Работа кіпіць ад ранку.

Галінкі збіраюць, пер’е.
Народнае кажа павер’е,

што шчасце паселіцца ў **хаце**,
як птушка з людзьмі паладзіць.

І **сонцам** абмыецца просінь.
Буслы будуць дзетак прыносіць.

І вечныя
будуць на **свеце**

дзеці і гнёзды,
гнёзды і дзеці.

*І. Рубін*

Раскажыце аб народным павер’і пра буслоў, якое існуе ў Беларусі. Калі не ведаеце, распытайце пра павер’е ў бацькоў ці суседзяў.

У якім з выдзеленых слоў гук ***ц*** заўсёды цвёрды? А ў якіх словах ён мяккі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 30*

## Звонкія і глухія зычныя

**146.** Прачытайце. Які гук трэба вымаўляць у канцы слоў першага слупка? А які — у канцы слоў другога слупка? Як праверыць напісанне адпаведных літар?

| | | | |
|---|---|---|---|
| зуб | суп | зубы | супы |
| бераг | арэх | берагі | арэхі |
| лёд | палёт | лёду | палёту |

Запішыце ў сшытак тры пары слоў разам з праверачнымі.

Узор. *Зуб — зубы, суп — супы, ... .*

**147.** Праслухайце. Які апошні гук паўтараецца ў слове *хлеб*? Паўторым верш разам. Які ваш любімы хлеб?

***

На сняданак і ў абед
на стале заўсёды хле.. .
Хле.. — святыня.
Хле.. — багацце.
Хле.. у хаце — шчасце ў хаце.

*А. Клышка*



Спішыце тры апошнія радкі. Устаўце прапушчаную літару. Падбярыце праверачнае слова. Запішыце яго ў сшытак.

Падбярыце праверачнае слова да слова *абед*. Запішыце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**148.** Прачытайце словы парамі. Як трэба правяраць напісанне літар глухіх і звонкіх зычных гукаў?

Узор. *Горад — гарады́, чарот — чараты́*, ... .

| | |
|---|---|
| Горад — гарады | чарот — чараты |
| гарбуз — гарбузы | аўтобус — аўтобусы |
| груз — грузы | тру́с — тру́сы |

Спішыце ў сшытак пары слоў з першага і другога слупка па ўзоры.

**149.** Прачытайце. Спішыце ў сшытак пары слоў. Устаўце прапушчаныя літары.

Гры.. — грыбы, са.. — сады, сця.. — сцягі, вё.. — вазіць, нё.. — насіць.



## Хвілінка-весялінка

**150.** Прачытайце.

Маленькую дзяўчынку спыталі:
— Колькі гукаў у слове «сад»?
— Тры, — хутка адказала яна.
— Якія?
— Грушы, яблыкі і слівы.

Як вы адкажаце на гэта пытанне?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 31*

## Звонкія і глухія зычныя

**151.** Прачытайце пары слоў. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Як праверыць напісанне літар?

Бярозка — бяроза, жабка — жаба, лыжка — лыжачка.

Казка — казачка, трубка — труба, кніжка — кніжачка.

**152.** Прачытайце пары слоў. Спішыце іх у сшытак. Устаўце прапушчаныя літары.

Ко..ка — каза, блі..ка — блізенька, ко..ка — каса, гра..ка — града, зага..ка — загадачка.

***153.** Прачытайце. Дайце тэксту загаловак.

Каля школы раслі **бярозкі**. За школай пачынаўся **сад**. У **садку радкамі** раслі пладовыя дрэвы: яблыні, ігрушы і слівы. Іх пасадзілі вучні **малодшых** класаў.

Прайшло шмат **год**. Дрэвы нагадваюць выпускнікам незабыўнае сяброўства.

*Паводле П. Рунца*

Выпішыце выдзеленыя словы. Напішыце праверачныя словы па ўзоры.

Узор. *Бярозка — бярозачка, ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**154.** Прачытайце і адгадайце загадку. Абгрунтуйце свой адказ.

Кусты да паркана туляцца.
Пад снегам схаваліся **сцежкі**.

Якое надвор'е на вуліцы,
калі не лепяцца **снежкі**?

*Т. Шылько*

Запішыце загадку ў сшытак разам з адгадкай. Да выдзеленых слоў падбярыце словы, якія правяраюць падкрэсленыя літары. Запішыце іх у дужках.

Словы для выбару: *сцежкай, сцяжынкай, сцежачкай; снежкай, сняжынкай, снежачкі.*

***155.** Прачытайце верш. Выпішыце выдзеленыя словы ў сшытак. Побач праз працяжнік напішыце праверачныя.

***

У малой **бяро..кі**
белая карыца.
Прычасаны **ко..кі** —
люба падзівіцца.
Трэба ж было выйсці
неяк з хлява **ко..кам:**
сталі **ко..кі** гры..ці
белую **бяро..ку**.
Мы сказалі **ко..кам:**
«**Гры..ці** дрэў не трэба,
хай гэта **бяро..ка**
вырасце да неба».

*А. Малышка*

Словы для даведкі: *козачкі, бярозы, косы, грызуць, бяроза, козачкам, бярозачкі, косачкі.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 32*

## Гук і літара *ў*

**156.** Прачытайце і адстукайце рукой словы па парце. Падзяліце на склады словы першага радка. Колькі складоў у словах першага і другога радка?

1. Ура, урок, узор, укол.
2. Леў, хлеў, кроў, зноў.

Спішыце словы. Падкрэсліце ***у*** і ***ў*** розным колерам.

Гук ***у*** — галосны, ён утварае склад і называецца **складовым**. *У-дзел*.

Гук ***ў*** — зычны, ён складу не ўтварае і называецца **нескладовым**. *Ка-роў-ка, браў*.

Літара ***ў*** *(у нескладовае)* пішацца пасля галосных, ***у*** *складовае* — пасля зычных і знакаў прыпынку.

*Паўлік жыве* ***ў*** *Мінску. Паўлік быў* ***у*** *тэатры.*

**157.** Прачытайце словы. Устаўце прапушчаную літару, падкрэсліце галосную перад ёй.

У з о р. *Трава — траўка.*

Карова — каро..ка.
Лава — ла..ка.
Сліва — слі..ка.
Дрэва — дрэ..ца.
Павел — Па..лік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**158.** Прачытайце словы. Вымаўляйце гук ***ў*** правільна.

Ластаўка, Слаўка, дзяўчынка, аўтобус, траўка, воўк.

Спішыце ў сшытак словы. Падкрэсліце ***ў***.

**159.** Змяніце словы і запішыце іх у сшытак. Дапішыце патрэбную літару, падкрэсліце яе. Як яна называецца?

Узор. *Хадзіла — хадзіў*.

Хадзіла — хадзі.. .
Рабіла — рабі.. .
Чытала — чыта.. .
Спявала — спява.. .
Мыла — мы.. .
Сябравала — сябрава.. .

**160.** Назавіце намаляваныя прадметы. Пакажыце на малюнку, дзе Слаўка, а дзе Паўлінка.



Па..лінка




А..тобус



Во..к



Ласта..ка



Сла..ка



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Спішыце ў сшытак подпісы. Устаўце прапушчаную літару.

Падкрэсліце літару, якую вы ўставілі. Які гук яна абазначае? Гэта гук галосны ці зычны?

*Урок 33*

## Гук і літара ў

**161.** Змяніце словы па ўзоры.

У з о р. *Плывец — плыўцы, трава — траўка, ... .*

Карова, канава, Вова, шавец, галава, дрэва, лава.

Запішыце ў сшытак словы, якія атрымаліся.

**162.** Прачытайце сказы. Спішыце. Устаўце прапушчаную літару, падкрэсліце яе.

Сла..ка хадзі.. у лес. Ён прынёс по..ны кошык грыбо.. . Бацька парадава..ся за сына.

**163.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце і закончыце сказы. Ужывайце замест малюнкаў словы з ***ў*** (нескладовым).

Бацька касіў  .

Хлопчык фарбаваў  .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзядуля зрабіў  .

Дзяніс пайшоў да  .

Запішыце сказы ў сшытак.

Словы для даведкі: *лаўку, шпакоўню, Паўліка, траўку.*

***164.** Прачытайце. Спішыце ў сшытак дзве пары сказаў. Правільна ўжывайце ***у*** і ***ў***.

1. Наша бабуля жыве ... вёсцы. Мы жывём ... горадзе.
2. Мой сябар жыве ... Навагрудку. Я жыву ... Мінску.
3. Ганна зараз ... бібліятэцы. Вольга знаходзіцца ... школе.
4. Антось хадзіў ... дзіцячы сад. Зараз ён ходзіць ... школу.

**165.** Складзіце словы па ўзоры.

Узор. *Узя(ў) — узяў, вё(ў) — вёў, ... .*

мы, вы, чу, ста → ў

кіну, вучы, ара, выціра → ў

Складзіце сказы са словамі *арaў, вучыў*. Запішыце сказы ў сшытак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 34*

## Гук і літара *й*. Адрозненне гукаў *і* і *й*

**166.** Прачытайце пары слоў. Якія з гэтых слоў можна падзяліць на склады? Чаму вы так лічыце?

| | | |
|---|---|---|
| гаі — гай | баі — бой | пакоі — пакой |
| краі — край | раі — рой | ручаі — ручай |

Спішыце пары слоў. Падкрэсліце літары ***і, й*** алоўкамі рознага колеру.

Гук ***і*** — галосны, ён утварае склад і называецца **складовым**. *І-мя, і-сці*.

Гук ***й*** — зычны, ён складу не ўтварае і называецца **нескладовым.**

Літара ***й*** абазначае на пісьме гук ***й*** пасля галосных і на канцы склада. *Май, зай-чык*.

***167.** Змяніце словы. Запішыце пары слоў. Падкрэсліце ***і, й***.

Героі — ... .
Ураджаі — ... .
Вуллі — ... .
Трамваі — ... .

**168.** Прачытайце. Запішыце сказы ў сшытак.

1. **Рой** сеў на дрэва. — Паляцелі два **раі** пчол.
2. У **гаі** растуць высокія дрэвы. — Мы пойдзем у **гай**.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. У **пакоі** чыста і ўтульна. — Я люблю свой **пакой.**
4. Хутка будзе **май.** — У **маі** пойдзем у лес.

Падкрэсліце ў выдзеленых словах ***і, й*** алоўкамі рознага колеру.

***169.** Прачытайце. Запішыце словы ў сшытак. Устаўце прапушчаныя літары.

За..чык, руча.., га..ка, вуле.., ма..ка, карава.., Андрэ.., крэ..да, ліне..ка, хво..ка, трамва.., папуга.. .

**170.** Вызначце парадак літар у радку і напішыце ў сшытак па ўзоры.

*аі – ай оі – ой краі – край героі – герой*

*Урок 35*

## Склад як частка слова

**171.** Дапішыце склады, каб у вас атрымаліся словы.

Ма-.., шко-.., сяб-.., та-.., ру-.., Ю-.., ву-.., Лю-.., на-.. .

**172.** Дапішыце склады ***ка-*** і ***ра-***, каб у вас атрымаліся словы.

| | |
|---|---|
| талер.. | та.. |
| ліс.. | ма.. |
| лыж.. | на.. |
| бул.. | ка.. |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**173.** Прачытайце словы. Перастаўце ў іх склады. Запішыце пары слоў у сшытак.

У з о р. *Лы-жы — жылы́, ... .*

Лы-жы, ка-ра, ка-мар, ма-ра, на-ра, ла-сі.

**174.** Да складоў ***на*** і ***ра*** дадайце яшчэ адзін склад, каб атрымаліся словы.

У з о р. *На-га, ... .*

на — га, ра, ша

ра — ма, на, са

Запішыце гэтыя словы ў сшытак.

**175.** Праслухайце. Як атрымаліся словы *зала, лаза*? Прачытайце, каб гучала слова *лаза*, а потым — *зала*. Параўнайце гэтыя словы. Чым яны адрозніваюцца?

### Каза

Не надзівіцца каза:
— От лаза-лаза-лаза!
— Дзе якая зала-зала?
Ты пра што, каза, казала?

*Н. Сторажава*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 36*

## Падзел слова на склады

**176.** Прачытайце словы. Колькі складоў у кожным слове? Адстуквайце склады рукой.

Вёска. Птушка. Кніжка. Рака. Дуб. Машына. Вясёлка. Канюшына.

Спішыце гэтыя словы. Падкрэсліце літары галосных гукаў.

**177.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце прадметы на іх.











Спішыце словы. Колькі ў кожным слове галосных гукаў? Колькі складоў?

Лес, дым, рак, кот, крот.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**178.** Прачытайце словы па складах. Кожны склад выдзяляйце стуканнем алоўка па парце.

Ра-нец, гум-ка, ша-фа, ву-чань, а-ло-вак, пе-нал.

Спішыце словы. Падкрэсліце літары галосных гукаў.

Словы дзеляцца на склады. Колькі ў слове галосных гукаў, столькі і складоў.

*Пар-та* — у слове два галосныя гукі і два склады.

***179.** Пакажыце і назавіце на малюнках дрэвы.



Складзіце са складоў і запішыце ў сшытак назвы дрэў.

Узор. *Лі-па*.

Па-лі, сна-са, бя-за-ро, ра-на-бі, ба-вяр.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**180.** Праслухайце.

Малы Віця — першакласнік. Ён прыйшоў са школы.

— Ну што, чаму цябе навучылі? — спыталася ў яго бабуля.

— Нічому не навучылі, — уздыхае хлопчык. — Заўтра сказалі зноў прыйсці.

Як доўга давядзецца Віцю хадзіць у школу?

Як назваць вучня першага класа адным словам? А вучня трэцяга класа?

*Урок 37*

## Перанос слоў па складах

**181.** Прачытайце словы. Колькі складоў у кожным слове? Адстуквайце склады рукой па парце.

Вёска. Дзяцел. Кніжка. Рака. Касавіца. Дуб. Машына. Рамонак.

Спішыце гэтыя словы. Падзяліце іх для пераносу. Якое слова нельга пераносіць?

Пераносіць словы з аднаго радка на другі трэба па складах: *зя-зю-ля, ва-вёр-ка*.

Адну літару нельга пакідаць на радку ці пераносіць на наступны радок: *агу-рок, лі-лея*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**182.** Прачытайце склады і ўтварыце словы. Запішыце гэтыя словы так, як іх можна пераносіць.

ша______лаш
мі__________ска
ра_____________зам
ма________________стак
май____________________стар

**183.** Прачытайце. У якім слупку словы падзелены на склады? У якім — для пераносу?

| | |
|---|---|
| а-ло-вак | ало-вак |
| кра-і-на | краі-на |
| ру-ча-і | ру-чаі |

Запішыце ў сшытак словы, падзеленыя для пераносу.

Чаму словы ў слупках падзелены на склады неаднолькава?

***184.** Прачытайце. Падзяліце словы на склады і для пераносу. Запішыце іх у сшытак.

Асіна, арэшнік, ясень, яліна, вяргіня, лілея, акацыя.

**185.** Прачытайце. Чым пахне лета? Запішыце гэтыя словы. Падзяліце іх для пераносу.

**Летам**

Пахне лета медуніцай,
спелай ягадай суніцай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Між лісточкаў, як жарынкі,
свецяць ягады малінкі.
А ў маліннiку гамонка:
там і Пеця, і Сымонка,
там Мікола і Марат —
любяць ягады збіраць.

*С. Бестава*

Хто збірае маліны?
Запішыце імёны. Падзяліце іх для пераносу.

## *Урок 38*

### Асаблівасці пераносу слоў з літарамі *дз* і *дж*

**186.** Спішыце словы ў сшытак. Падзяліце іх для пераносу.

Студзень, дожджык, дзеці, Дзяніс, джэмпер, Джэк.

Узор. 1. *Сту-дзень, ... .*
2. *Дож-джык, ... .*

Пры пераносе слоў літары ***дз*** і ***дж*** падзяляць нельга: *ня-дзе-ля, ся-джу.*

**187.** Прачытайце. Спішыце ў сшытак. Падзяліце словы для пераносу.

1. Дзіма, Федзя, Вадзім, Надзя, Валодзя.
2. Гняздзечка, халадзец, адзенне, хадзіць, знайдзіце, садзіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**188.** Прачытайце словы. Спішыце іх. Падзяліце іх для пераносу.

Джынсы, джэмпер, дождж, Джэк, джала, джэм, джунглі.



## Хвілінка-весялінка

**189.** Прачытайце.

Я спытаў у брата Федзі,
чаму белыя мядзведзі.
Усміхнуўся хітра Федзя:
— Ты спытайся ў мядзведзя!

*М. Салаўцоў*

А як бы вы адказалі на пытанне хлопчыка? Якога колеру бываюць мядзведзі?

Запішыце ў сшытак слова *мядзведзі*. Падзяліце яго для пераносу.

**190.** Прачытайце і адгадайце загадку.

***



Першая вясну нясе.
**Сядзе** — хвосцікам трасе.
Вунь **сядзіць** — вясна ўжо блізка:
прыляцела, значыць, ... .

| П | | | С | | А |
|---|---|---|---|---|---|

*Н. Парукаў*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падзяліце іх для пераносу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 39*

### Асаблівасці пераносу слоў з літарамі *й* і *ў*

**191.** Прачытайце словы. Падзяліце іх на склады і запішыце ў сшытак па ўзоры.

Узор. *1. Майка — май-ка, ... .*
*2. Дрэўца — дрэў-ца, ... .*

1. Майка, лейка, зайчык, гуляй, пайшоў, сядай, чайка, чайнік.
2. Дрэўца, дзяўчынка, доўгі, аўсянка, забаўляў.

Пры пераносе слоў літары ***й*** і ***ў*** не аддзяляюцца ад літары галоснага гука: *чай-ка*, *жаў-рук*.

**192.** Прачытайце імёны хлопчыкаў і дзяўчынак. Падзяліце словы для пераносу.

Сяргейка, Паўлік, Марыйка, Надзейка, Слаўка, Паўлінка.

***193.** Прачытайце пра літару ***й***.

Літару ***й*** (*і* нескладовае) можна назваць спартыўнай. З ёй пішуцца *валейбол, шайба*.

Літару ***й*** (*і* нескладовае) можна назваць птушынай. З літарай ***й*** пішуцца назвы птушак: *верабейчык, папугайчык, канарэйка, салавейка*.

Літару ***й*** (*і* нескладовае) можна назваць ветлівай. З ёй пішуцца словы *дaруйце, выбачайце, дзякуй*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Выпішыце словы з ***й*** адной групы (на выбар). Падзяліце іх для пераносу.

**194.** Прачытайце словы. Вусна падзяліце іх для пераносу.

Настаўнік — настаўніца, сябар — сяброўка, працаўнік — працаўніца, воўк — ваўчыха.
Дрэва — дрэўца, галава — галоўка.
Лава — лаўкі, кравец — краўцы.

Запішыце дзве пары слоў (на выбар). Падзяліце іх для пераносу.



## Хвілінка-весялінка

**195.** Прачытайце. Чаму Слаўку здалося, што вецер чытае кніжку?

### Вецер чытае

Задрамаў у садзе Слаўка.
Кніжку палажыў на лаўку.

Наляцеў вятрыска з поля,
пагартаў яе паволі.

Слаўка ўбачыў, разважае:
— Дзіва! Вецер — і чытае.

*П. Пранузa*

Спішыце ў сшытак два першыя сказы. Падзяліце словы для пераносу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 40*

## Асаблівасці пераносу слоў з мяккім знакам *(ь)*

**196.** Прачытайце імёны. Спішыце іх. Падзяліце для пераносу.

Алеська, Міхаська, Антоська, Зоська, Марыська, Марылька, Вольга.

Пры пераносе слоў літара мяккі знак **(ь)** не аддзяляецца ад папярэдняй зычнай: *бацьь-ка, Воль-га.*

**197.** Прачытайце тэкст.

**Здарэнне ў лесе**

Сабраліся Васілька, Міхаська і Марыська ў лес. Дзеці пайшлі праз квяцісты луг. Ажно заяц бяжыць! Васілька пабег за зайцам. Прабег некалькі крокаў і бух у траву. Дзеці засмяяліся: «Васілька зайца злавіў!»

*Паводле В. Пашкевіч*

Куды сабраліся дзеці?
Хто бег праз квяцісты луг?
Хто лавіў зайца?
Чаму дзеці весела засмяяліся? Як бегае заяц?
Запішыце ў сшытак першы сказ і сказ *Васілька зайца злавіў!* Падзяліце ўсе словы для пераносу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***198.** Паслухайце.

## Слёзы на вокнах

Дзед Цімох дроў не пашкадаваў, добра пратапіў печ. У хаце пацяплела.

Алежка падышоў да акна і пачаў прыглядацца. На шкле хлопчык убачыў **дробненькія** і празрыстыя **кропелькі** вады. Яны цякуць адна за адной уніз. Дзед Цімох пацікавіўся: што выглядае яго ўнук? Хлопчык паказаў на кропелькі і сказаў:

— Вокны ў нас плачуць.

— Сапраўды, — пагадзіўся дзед. — Ад цяпла **расчуліліся**.

*Паводле П. Кавалёва*

Што Алежка ўбачыў на вокнах? Чаму на шкле былі кропелькі вады?

Што сказаў хлопчык? Прачытайце адказ.

Чаму вокны плакалі? Што сказаў дзед Цімох? Прачытайце.

Выпішыце выдзеленыя словы. Падзяліце іх для пераносу.

Складзіце сказ са словам *расчуліліся*.

**199.** Адгадайце словы з дапамогай іх тлумачэнняў. Запішыце гэтыя словы. Падзяліце іх для пераносу.

1. Як маму і тату назваць адным словам?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Б | | | | | |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Як называецца прыродная з’ява з грымотамі і маланкамі?

| Н | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

3. Чаго ў вас па пяць на кожнай руцэ і кожнай назе?

| П | | | | | | 
|---|---|---|---|---|---|



## Хвілінка-весялінка

**200.** Паслухайце верш.

### Школьны ранец

У Міколкі-Мікалая
ранец,
што кладоўка тая.
І чаго няма ў ім
толькі:
**апельсінавыя долькі,**
шайба,
сыр для кошкі,
клюшка,
ад вядра старога
дужка…
**Шпулька нітак,**
ёсць аловак,
дзённік,
сшытак
амаль новы…
Усяго-ўсяго
ў дастатку,
аднаго няма —
парадку.

*І. Бурсаў*

Чаго няма ў школьным ранцы Міколкі?

Пакажыце, як вы складаеце ў ранец школьныя рэчы.

Запішыце назву верша і выдзеленыя словы. Падзяліце іх для пераносу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Урок 41*

## Націск. Адрозненне націскных і ненаціскных складоў

**201.** Разгледзьце малюнкі. Прачытайце подпісы пад малюнкамі. Вымаўляйце націскны склад з большай сілай.



Касá




Кáса



Дамы́



Дáмы

Запішыце словы ў сшытак. Пастаўце ў іх націскі.

Склад у слове, які вымаўляецца з большай сілай, называецца **націскным**. Астатнія склады ненаціскныя. ***Гомель, Орша,*** *таварыш*.

У словах з аднаго складу націск не ставіцца. *Сад, год, мяч.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***202.** Паслухайце тэкст. Назавіце тры пары слоў, якія адрозніваюцца месцам націску.

Летняя пара. Над лугам плыве лёгкая пара. А гэта наша рака. У ёй мы ўчора злавілі вялікага рака. Трэба і сёння капаць чарвякоў. Пачынае капаць дождж ык!

Спішыце два першыя сказы. Пастаўце націск у словах, якія адрозніваюцца націскам.

Растлумачце сэнс гэтых слоў.

З адной парай слоў складзіце новыя сказы і запішыце іх.

**203.** Спішыце ў сшытак спачатку словы з націскам на першым складзе, а потым — словы з націскам на другім складзе.

Майка, трусы, суkenка, штаны, тапкі, боты, стужка, кофта, джэмпер, джынсы.

***204.** Прачытайце словы. Правільна іх вымаўляйце.

Маленькі, малы, імя, стары, звоніць, валёнкі, некаторы.

Спішыце словы ў сшытак. Пастаўце націск.

***205.** Прачытайце сказы. Выдзяляйце голасам націскныя склады ў словах.

1. Па дарозе ехалі два вазы з сенам.
2. У зале паставілі дзве вазы з кветкамі.
3. Марак меў многа марак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Я сказаў некалькі сказаў.
5. Верабей ад страху схаваўся пад страху.

Спішыце сказы. Пастаўце націск у аднолькавых па напісанні словах.

## *Урок 42*

### Вымаўленне націскных і ненаціскных складоў. Правапіс *о, э — а*

**206.** Прачытайце пары слоў. Вымаўляйце націскныя склады з большай сілай голасу. Якія літары пішуцца ў націскных складах? Якая літара пішацца ў ненаціскных складах?

| | |
|---|---|
| кот — каты́ | цэгла — цагля́ны |
| воз — вазы́ | нос — насы́ |
| цэны — цана́ | плот — платы́ |
| стрэхі — страха́ | рэкі — рака́ |

Спішыце ў сшытак тры пары слоў з двух слупкоў. Пастаўце націск. Падкрэсліце літары, як у падручніку.

Пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных вымаўляюцца галосныя ***о, э***. Іх літары пішуцца толькі пад націскам.

Не пад націскам ***о, э*** змяняюцца на ***а*** (гэта з’ява называецца аканнем). *Лось — ласі́, рэчка — рака́.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**207.** Прачытайце словы. Якую літару вы ўставіце ў словы?

| | |
|---|---|
| волас — в..ласы — в..ласок | дрэва — др..ўляны |
| голас — г..ласы — г..ласок | сэрца — с..рдэчны |
| год — г..ды — г..док | рэчка — р..чны |
| горад — г..рады — г..радок | шэрсць — ш..рсцяны |

Спішыце па два радкі слоў з кожнага слупка. Устаўце прапушчаную літару. Пастаўце націск.

***208.** Прачытайце. Спішыце сказы пра моркву. Устаўце прапушчаныя літары.

Мы жывём ў г..радзе Мінску. Мама завязе мяне на лета да бабулі. Бабуля жыве ў г..радку Мір. Недалёка ад дома бабулі працякае р..чка Міранка. Я буду плаваць у р..цэ. А яшчэ я буду дапамагаць бабулі палоць м..ркву. Я вельмі люблю піць м..ркоўны сок.

**209.** Разгледзьце малюнкі. Запішыце сказы ў сшытак. Замяніце малюнкі словамі.

Па р..цэ плыве  .

Па р..цэ плывуць  .

Словы для даведкі: *човен, чаўны*.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**210.** Прачытайце і адгадайце загадкі. Запішыце адну з іх у сшытак разам з адгадкай (на выбар). Замест кропак устаўце патрэбныя літары.



1. Хто зялёнымі в..чамі
   грозна бліскае н..чамі?
   Мае пухленькія лапкі,
   мае кіпцікі-царапкі.
   Спінку пругка выгінае,
   страх на мышак наганяе.

*У. Мацвеенка*



2. Летам я — р..гатая,
   восенню — хв..статая.
   Хоць і горкая зусім,
   ды патрэбная ўсім.

*М. Пазнякоў*

*Урок 43*

## Вымаўленне націскных і ненаціскных складоў. Правапіс *о, э — а*

**211.** Прачытайце. Дакажыце, што галосныя гукі беларускай мовы выразна чуваць толькі пад націскам. У які гук пераходзяць гукі ***о*** і ***э***?

стол — ст..лы
дом — д..мы
двор — дв..ры

рэбры — р..бро
рэкі — р..ка
стрэхі — стр..ха



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

совы — с..ва                цэны — ц..на
горы — г..ра                цэгла — ц..гліна

Спішыце словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце літары. Пастаўце ў словах націск.

***212.** Прачытайце ўважліва сказы. Што ў іх пераблытана? Змяніце словы ў дужках.

1. За сялом пачынаўся (бары). 2. Дзеці збіралі грыбы ў (бор). 3. Таццяна ўжо (хадзіць) у трэці клас. 4. А яе маленькая сястрычка толькі пачала (ходзіць).

Спішыце сказы ў сшытак. Дужкі раскрывайце. Пастаўце націск у словах, якія былі ў дужках.

**213.** Прачытайце тэкст. Дайце яму назву.

Каля р..кі чуваць дзіцячыя г..ласы. Нечакана сыпануў дождж. Дзеці ад д..жджу схаваліся пад вялікімі дрэвамі.

Спішыце тэкст. Устаўце ў словы прапушчаныя літары. Пастаўце ў словах націск.

**214.** Прачытайце сказы. Спішыце іх у сшытак. Устаўце ў словы прапушчаныя літары.

1. Сухое сена склалі ў стог. На лузе стаіць многа ст..гоў. 2. За нашай школай ёсць горка. Добра



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з гэтай г..ры катацца на санках. 3. Шырока разлілася вясной рэчка. Дзеці пабеглі глядзець разліў р..кі.



### Паразмаўляем

**215.** Прачытайце. Паразмаўляйце з суседам па парце на тэму «Пасля школы» па ўзоры.

— Галя, ты не ведаеш, куды пайшла Марына?
— Ведаю, Алеся. Яна пайшла дамоў.
— Яна ж хацела пайсці на маляванне.
— Так, хацела. Але за Марынай прыехаў тата на машыне.
— Шкада. Я хацела пайсці з ёй.
— Мне таксама шкада. Я хацела пайсці з вамі.
— Да пабачэння. Пойдзем у другі раз.
— Да пабачэння.



### Хвілінка-весялінка

**216.** Прачытайце верш-загадку. На якім складзе вы паставіце націск у слове *вазы*? Чытайце ўважліва: што было ў вазах?

**За тры вазы**

За тры вазы дзеразы
купіў тата тры казы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

А ці кожнаму вядома —
па чым козы ішлі дадому?

*В. Вітка*

Калі вы правільна адгадаеце загадку, тады зразумееце, што гэта не проста верш, а верш-смяшынка. Падказка:

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| П | | | Д | | | | Е |

## *Урок 44*

### Выяўленне націскных і ненаціскных складоў. Правапіс *е, ё — я*

**217.** Прачытайце. Якія літары не пад націскам перайшлі ў ***я***?

лёд — лядо́к  
мёд — мядо́к

лес — лясны́  
свеціць — святло́

Спішыце словы. Пастаўце націск. Падкрэсліце літару галоснага гука ў першым складзе перад націскам.

> Замест ***е, ё*** ў першым складзе перад націскам пішацца ***я*** (такая з'ява называецца яканнем).

**218.** Спішыце словы ў сшытак. Устаўце замест кропак патрэбную літару. Падкрэсліце першы склад перад націскам.

елка — ..ловы  
сёстры — с..стра  
светлы — св..тло

нёс — н..суць  
вёз — в..зуць  
вёў — в..дуць



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***219.** Прачытайце словы. Спішыце іх. Пастаўце націск. Лічбамі абазначце месца складу перад націскам. Калі на месцы ***е, ё*** пішацца ***я***, а калі не пішацца?

Узор.

*Лес — $\overset{1}{\text{ля}}$со́к — $\overset{1}{\text{ля}}$сны́ — $\overset{1}{\text{ля}}$сні́к — $\overset{2}{\text{ле}}\overset{1}{\text{са}}$ві́к*

цёплы — ц..пло — ц..плыня
мёд — м..довы — м..давік
снег — сн..гі — сн..гавы

**220.** Прачытайце сказы. Устаўляйце замест трох кропак прапушчаныя словы, замест дзвюх кропак — прапушчаныя літары.

1. Дзеці сп..валі ... песні. 2. Каля лесу прал..гала ... сц..жынка. 3. Каця і Віця б..гуць праз ... луг. 4. Чайкі л..целі над ... возерам.

Словы для даведкі: *пясчаная, квяцісты, лясным, святочныя*.

**221.** Прачытайце скорагаворку. Хто працуе? Што робіць дзед? Што робіць баба? Якую літару вы ўставіце ў словы? Чаму?

**Лежань, седзень**

Лежань лежма л..жыць.
Седзень седзьма с..дзіць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Б..гун бегма б..жыць.
Крыкун крычма крычыць.
Гультай гульма гуляе.
Абібок бок абівае.
Баба дом даглядае.
Дзед унукаў забаўляе.
*В. Вітка*

Спішыце ў сшытак першыя тры сказы. Пастаўце ў словах націск.

*Урок 45*

## Вымаўленне націскных і ненаціскных складоў. Правапіс *е, ё — я*

**222.** Прачытайце. Хто падмятаў двор: Мікола ці мятла? Якую літару трэба ўставіць у словы? Чаму?

Выхвалялася м..тла:
— Да паўдня я двор м..ла!
І яшчэ б м..ла, м..ла
аж да самага ц..мна.
Ды Мікола ўспацеў —
месці больш не захацеў.
*В. Карпечанка*

Выпішыце з верша словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**223.** Прачытайце. Спішыце словы з прапушчанымі літарамі.

| | |
|---|---|
| вецер — в..тры | вёслы — в..сло |
| звер — зв..ры | вёдры — в..дро |
| дзень — дз..нькі | мётлы — м..тла |
| вербы — в..рба | цёплы — ц..пло |

Складзіце і запішыце ў сшытак сказы з адной парай слоў (на выбар).



## Хвілінка-весялінка

**224.** Прачытайце народны жарт.

### Дзіцятка

Аднаго разу сядзелі купцы ў заезным двары. Маці хлопчыка выйшла з хаты. Хлопчык пачаў крычаць, зваць маці. Крычаў, крычаў, пакуль не змарыўся. Тады змоўк.

— Ну, дзякуй Богу, перастаў, — кажа адзін купец.

А хлопчык пачуў і кажа:

— Ага, перастаў! Адпачну ды зноў буду.

Што вы можаце сказаць пра хлопчыка?

***225.** Прачытайце. Дапоўніце сказы словамі па сэнсе. Запішыце чатыры сказы ў сшытак. Устаўце прапушчаныя літары.

| | |
|---|---|
| Лес апрануўся ў | л..сы |
| Шумяць зялёныя | з..лень |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| Над возерам растуць | в..рба |
| Сёлета рана распусцілася | в..рбы |
| Гракі зрабілі на дрэвах | гн..зды |
| Вясной птушка робіць сабе | гн..здо |

**226.** Прачытайце верш. Якія літары вы ўставіце ў словы? Запішыце ў сшытак гэтыя словы, устаўляючы літары.

**Мой край**

...Мой край — б..люткія б..розы
абапал сіняе р..кі.
Высока ў небе вырай кружыць,
л..ціць за сіні н..бакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
сваю з..млю, свой родны край.

*В. Вярба*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД

## *Урок 46*

**227.** Разгледзьце малюнак.




Прачытайце сказы. Замест кропак устаўляйце імёны дзяўчынак.

У ... дзень нараджэння. Яе павіншавала ... . Яна падарыла ёй дзівосны букет і мядзведзіка. Ён прынёс ... бочачку мёду.

Запішыце тэкст. Устаўце ў сказы імёны, якія вам падабаюцца.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**228.** Прачытайце. Устаўляйце прапушчаныя словы.

(Х т о?) ... выцірае з мэблі (ш т о?) ... .
(Х т о?) ... варыць (ш т о?) ... .
(Х т о?) ... ў боршч дадае (ш т о?) ... .

Пакажыце дзеянні.

Запішыце сказы ў сшытак. Падкрэсліце ўстаўленыя словы.

Словы для даведкі: *соль, пыл, суп; Рыта, маці, бабуля.*

***229.** Прачытайце пытанні. Вусна на іх адкажыце.

Кім хоча быць Ігар?
Кім марыць быць Валодзя?
Кім працуе маці Сашы?
Кім працуе брат Яўгена?
Кім будзе Міколка?

Запішыце ў сшытак два адказы на пытанні (на выбар).

Узор. *Ігар хоча быць шафёрам.*
*Маці Сашы працуе поварам.*

Пакажыце дзеянні, якія выконваюць людзі розных прафесій.

! **Цясля́р** — рабочы, які апрацоўвае драўніну.

Словы для даведкі: *цесляром, поварам, прадаўцом, будаўніком, шафёрам.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



## Хвілінка-весялінка

**230.** Прачытайце.

### Трактар

Роўным трактам
ехаў трактар.
Меў, напэўна, злы характар,
бо бурчаў, як той Барбос,
чыхкаў, нібы паравоз.

*Д. Бічэль*

З кім у вершы параўноўваецца трактар?
Пакажыце, як едзе трактар. Як ён «бурчыць»?

**231.** Прачытайце. Устаўляйце прапушчаныя словы.

1. На небе ... яркае сонца.
   На дрэвах ... прыгожыя снегіры.
   Белы снег ... сінімі агеньчыкамі.

2. ... вядзе ўрок.
   ... расказвае пра сваю экскурсію.
   ... весела гулялі на вуліцы.

Запішыце ў сшытак па два сказы з кожнай групы.

Словы для даведкі: *сядзяць, ззяе, блішчыць; тата, дзеці, настаўнік.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 47*

**232.** Прачытайце. Назавіце імёны і прозвішчы дзяцей.

На ўроку чытання Віця Корзун расказаў верш. Ліза Новік адказвала на пытанні. Андрэй Прастак працаваў у пары з Аляксеем Гарэзам.

Спішыце сказы. Падкрэсліце словы, што абазначаюць прадметы, адной лініяй; словы, што абазначаюць дзеянні, — дзвюма лініямі.

**233.** Прачытайце словы.

Кот, лісіца, заяц, сабака, конь, воўк, мядзведзь, карова.

Назавіце свойскіх і дзікіх жывёл. Запішыце ў сшытак.

Узор. (Хто?) *кот, ... — свойскія жывёлы.*
(Хто?) *лісіца, ... — дзікія жывёлы.*

**234.** Прачытайце пары слоў. Запішыце іх. Падкрэсліце літары звонкіх зычных гукаў адной рыскай, а парных глухіх зычных — дзвюма рыскамі.

лужок — пушок
Зіна — Сіма
птах — дах
каса — каза



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**235.** Прачытайце. Спішыце. Устаўце прапушчаныя літары ***д — дз*** або ***т — ц***.

Заво.. — на заво..е, карагод — у караго..е, бало..а — на бало..е, гора.. — у гора..е, са.. — у са..е, рабо..а — на рабо..е.

Якія гукі абазначаюць прапушчаныя літары?



**Хвілінка-весялінка**

**236.** Праслухайце.

— Тата, колькі жывуць мышы?
— Гэта залежыць ад катоў, сынок.

Чаму так адказаў тата?
У якіх словах тэксту ўжыты толькі цвёрдыя зычныя?

## *Урок 48*

**237.** Прачытайце. Устаўце патрэбныя словы.

1. У Зосі забалеў ... . — ка..а
2. У Зіны прыгожая ... . — ка..а
3. Бабуля зварыла смачны ... . — зу..
4. У агарод забегла ... . — су..

Запішыце сказы ў сшытак. Устаўце прапушчаныя словы і літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**238.** Прачытайце. Запішыце назвы дрэў па ўзоры.

У з о р. *У садзе растуць пладовыя дрэвы:* (ш т о?) *яблыня, ... .*
*У лесе растуць:* (ш т о?) *бяроза, ... .*

Яблыня, бяроза, дуб, ігруша, вішня, ліпа, сліва, клён.

***239.** Чытайце верш і называйце літары, якія вы будзеце ўстаўляць у словы: ***д*** або ***т***, ***ж*** або ***ш***, ***з*** або ***с***. Якія гэтыя літары: мяккіх ці цвёрдых гукаў?

**Гра..ка**

Гра..ка ў Ганулі.
Там расце цыбуля.
А на схілах гра..кі
светлая сала..ка,
рэдзькі шмат сало..кай
з хвосцікам каро..кім.
На зыбучых но..ках
там стаіць гарошак.
Ад гаро..ку blі..ка
белая рады..ка.

*К. Буйло*

Выпішыце з верша словы з прапушчанымі літарамі. Падбярыце і запішыце да іх праверачныя словы.

**240.** Прачытайце тэкст. Назавіце яго тэму. Дайце загаловак.

Даша і Данік пайшлі ... лес. Дзеці ..бачылі там ..ятла. У яго до..гая ..юба. ..яцел лечыць дрэвы.

Спішыце тэкст. Устаўце прапушчаныя літары.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**241.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Цягнецца нітка
без канца, без краю.
Ні яе парваць,
ні ў клубок зматаць.





Запішыце ў сшытак загадку разам з адгадкай.

## *Урок 49*

***242.** Прачытайце словы. Як можна назваць гэтыя рэчы адным словам?

Кампот, каша, рыба, масла, бульба, мяса, пірог.

Спішыце словы. Пастаўце ў іх націск.

Узор. *Кампóт, ... — гэта ... .*

**243.** Адкажыце на тры пытанні пісьмова.

Узор. *Дзеці плылі на плыце.*
*У пустыні ездзяць на вярблюдзе.*

1. На чым дзеці плылі па рацэ?
2. На чым мы ляцелі на адпачынак?
3. На чым касманаўт паляцеў у космас?
4. У чым прынесці пакупкі з крамы?
5. Дзе растуць агуркі?

Словы для даведкі: *самалёт, плыт, ракета, града, пакет.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**244.** Прачытайце.

Летам ... школьніка.. канікулы. Летнія дзян..кі сонечныя і цёплыя. Дзеці з бац..камі прыйшлі ... лес. Там яны ..бачылі шустран..кую вавёрку.

Спішыце тэкст. Устаўце прапушчаныя словы і літары.

Падкрэсліце хвалістай лініяй словы, якія называюць прыметы прадметаў.

**245.** Прачытайце. Дапоўніце сказы словамі. Што называюць гэтыя словы: прадметы, дзеянні ці прыметы прадметаў?

На кветніку зацвілі ... в..ргіні. На агаро..е выраслі ... памідоры. Іванка чытаў ... кні..ку. Соня купіла ... булачку.

Запішыце сказы. Устаўце прапушчаныя словы і літары.

Словы для даведкі: *чырвоныя, прыгожыя, смачную, цікавую.*

**246.** Разгледзьце малюнкі. Пакажыце твар вясёлы, сумны, здзіўлены, раззлаваны.





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Маня разбіла кубак. У яе твар ... .
Алена сустрэла сяброўку. У яе твар ... .
Лёня парваў кнігу Стася. У Стася твар ... .
Рыгор убачыў малпу. У Рыгора твар ... .

Словы для даведкі: *раззлаваны, радасны, сумны, здзіўлены.*

## *Урок 50*

**247.** Разгледзьце малюнкі. Назавіце кветкі. Запішыце ў сшытак подпісы да малюнкаў з апорай на нумары кветак.

1.



***

Расцвілі ўлетку
шматлікія кветкі.
Раз, два, тры,
чатыры, пяць.
А ці можна іх назваць?

*Т. Шылько*

2.



3.



4.



5.



Словы для даведкі: *званочак, васілёк, нарцыс, ружа, рамонак.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**248.** Прачытайце тэкст. Спішыце. Устаўце мянушкі жывёл. Падзяліце іх для пераносу.

Узор. *Хаў-рон-ня*.

Гэта наша свіння ... . Я дапамагаю бабулі даглядаць яе. Я заганяю свінню ў хлеў. А яшчэ я сябрую з сабакам ... і катом ... .

Словы для даведкі: *Барсік, Хаўроння, Максік*.



## Паразмаўляем

**249.** Разыграйце ў пары размову. Ужывайце імёны і імёны па бацьку сваіх бацькоў.

Узор.

Як завуць твайго тату?

— Майго тату завуць Мікалай Пятровіч. А твайго?

— Андрэй Андрэевіч.

— А як завуць тваю маці?

— Галіна Іванаўна. А тваю?

— Марыя Фёдараўна.

Выпішыце ў сшытак імёны і імёны па бацьку.

**250.** Прачытайце тэкст. Спішыце. Падзяліце для пераносу імёны дзяўчынак.

У школе Па..лінка добра вучыцца. Яна ..важліва слухае наста..ніцу. Дзя..чынка за..сёды дапамагае сваёй сябро..цы Ал..біне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**251.** Прачытайце словы. Падзяліце іх для пераносу.

Чайка, майка, лайка, чайнік, гайка, лейка, байка.

З двума словамі на выбар складзіце і запішыце сказы.

*Урок 51*

**252.** Прачытайце.

Хуткага ката называюць ... . Кот ... любіў муркаць. Маленькае кацяня назвалі ... .

Спішыце сказы ў сшытак. Устаўце мянушкі.

Словы для даведкі: *Мурлыка, Максімкам, Ветрыкам*.

**253.** Слухайце і паказвайце стоячы.

**Вяргіні летам**



Мы — **прыгожыя** вяргіні. Мы любім сонца. Мы любім лёгкі, цёплы ветрык.

Мы гойдаемся і весялімся.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

### Вяргіні позняй восенню

Мы **сумныя**. Мы схілілі свае галоўкі. Мы гінем.

Спішыце ў сшытак той тэкст, які вам больш спадабаўся.

Што абазначаюць выдзеленыя словы: прадметы, дзеянні ці прыметы прадметаў?

**254.** Да слоў дадайце літару або склад, каб атрымалася новае слова.

Узор. *Луг — плуг.*

Жар — па.., сок — ля.., нос — пад.., рот — к.., мех — с...

Запішыце словы. У дужках абазначце, колькі складоў у кожным слове.

**255.** Прачытайце.

### Лічылка

Валя, Галя і Вало..я
полюц.. боб на агаро..е.
Ця..ка боб палоц.. густы,
памагчы ім пой..еш ты.

*І. Вярыга*

Спішыце лічылку. Устаўце ў словы прапушчаныя літары.

Вывучыце лічылку на памяць.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***256.** Прачытайце. Пакажыце і назавіце кветкі на малюнках. Запішыце назвы кветак. Падкрэсліце літары зацвярдзелых зычных гукаў.








Складзіце сказ з назвай вашай любімай кветкі.

Словы для даведкі: *ландышы, цюльпаны, язмін, вяргіні, астры, касачы.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## *Урок 52*

**257.** Прачытайце пажаданні. Што вы пажадаеце адно аднаму?

***

Няхай лета
будзе сонцам абагрэта!
Няхай растуць ягады, грыбочкі,
гарбузы і агурочкі!
Ну, і вы расціце, дзеці,
і хай будзе мір на свеце!

*Т. Шылько*

Знайдзіце і выпішыце словы, якія маюць толькі цвёрдыя гукі.

Складзіце з адным з такіх слоў сказ і запішыце.

**258.** Прачытайце.

Мама стамілася. У яе дрэнны настрой. Да яе падышла дачка.

Яна пачала гаварыць маме ласкавыя словы:

— Мамачка, мамулечка, мілая, лю́бая, ты ў мяне самая добрая, лепшая ў свеце. Я цябе вельмі люблю.

Настрой у мамы адразу палепшыўся.

Якімі словамі вы будзеце паляпшаць настрой свайго таты?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**259.** Прачытайце. Складзіце сказы з апорай на малюнкі. Запішыце сказы.

Віця падарыў маме  .

Галя падарыла тату  .

Брат падарыў сястры  .

Сястра падарыла брату  .

Які падарунак вы хацелі б атрымаць?

***260.** Прачытайце. Што аўтар верша раіць чалавеку?

***

Што сядзець дзень цэлы дома!
Вас чакае лес і поле.
Не шкадуйце вы хвілінкі
пастаяць каля ялінкі.
Каля птушачкі, жучка,
страказы і чарвячка.

*Т. Шылько*

Выпішыце словы з тэксту, якія адказваюць на пытанне ш т о?

Што абазначаюць гэтыя словы?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**261.** Разгледзьце малюнкі. Якое бывае надвор'е? Пагуляем у гульню «Верабейчык». Паслухайце.







Уявіце сябе верабейчыкамі.

Я буду паказваць малюнкі. А вы расказвайце і паказвайце, як вы сябе адчуваеце.

*Малюнак «Сонейка»*

Вучань-верабейчык расказвае і паказвае:

— Я маленькі верабейчык. Я вельмі люблю сонейка. Я скачу вось так: скок-скок. Я спяваю вось так: чык-чырык. Я вясёлы. Я шчаслівы.

*Малюнак «Сонейка схавалася за хмарку»*

Я маленькі **верабейчык.** Я надзьмуўся ад холаду вось так. Я гойдаюся ад ветру вось так. Я сумны.

*Малюнак «Ідзе дождж»*

— Я маленькі верабейчык. Я не люблю **дожджык.** Ён мочыць мае **крыльцы.** Я лячу пад страху вось так. Тут суха і цёпла.

*Т. Шылько*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падзяліце іх для пераносу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**262.** Паслухайце верш. Разгледзьце малюнкі. Па малюнках і тэксце адкажыце вусна на пытанні па чарзе.

### Лета



У сукенцы каляровай,
у хусцінцы васільковай
ходзіць лета па палях,
па расквечаных лугах...
Дбайна сонечнае лета
спеліць ягады для дзетак.
Любіць з імі забаўляцца,
загараць, спяваць, купацца.
Дораць дзеці лету ўсмешкі,
гульні, песні і пацешкі.
А расчуленае лета
дорыць ім букеты кветак.

*Н. Галіноўская*

1. У якой сукенцы ходзіць лета? У якой хусцінцы?
2. Што спеліць лета і для каго?









Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Што любіць рабіць лета? Адкажыце словамі верша.
4. Што дзеці дораць лету?
5. Што дорыць расчуленае лета дзецям?

Спішыце наступныя сказы. Устаўце прапушчаныя словы.

1. Лета ходзіць у ... сукенцы і ў ... хусцінцы.
2. Лета любіць з дзецьмі забаўляцца, ..., ..., ... .
3. Дзеці дораць лету ..., ..., ... і ... .
4. Расчуленае лета дорыць дзецям ... ... .



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# АРФАГРАФІЧНЫ СЛОЎНІК

**А**
агаро́д
агрэ́ст
агуро́к
ало́вак
аўто́бус

**Б**
Белару́сь
бу́льба
бура́к
бу́сел
бяро́за

**В**
вавёрка
вераб́ей
ве́расень
ве́цер
ві́шня
во́жык
во́сень
ву́чань
вясна́

**Г**
гняздо́
го́рад
гру́ша
грыб

**Д**
дая́рка
дзіця́
дзяўчы́нка
дзя́цел
дождж

**Ж**
жні́вень
жо́луд
жо́ўты
жураве́ль
жывёла
жы́та

**З**
заапа́рк
заво́д
зара́дка
зіма́
зубр
зямля́

**І**
іго́лка
ігра́ць
імя́
інды́к
ісці́



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**К** камп'ю́тар
капу́ста
каро́ва
касмана́ўт
кастры́чнік
кве́тка
клас
конь
красаві́к
ку́рыца

**Л** ле́та
лён
лі́пень
лістапа́д
лы́жа
лю́ты

**М** май
малато́к
мале́нькі
малі́ны
маро́з
Масква́
метро́
Мінск
мо́рква
мэ́бля

**Н** напа́рстак
нараджэ́нне
наста́ўнік
ні́зкі
ні́тка
ноч

**П** парэ́чкі
пе́вень
пена́л
піла́
пло́шча
пра́ца
пту́шка
пшані́ца

**Р** рабо́чы
ра́дасць
Радзі́ма
раке́та
ра́ніца
руча́й
ру́чка
ручні́к



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**С**

садавіна́
сакаві́к
сало́дкі
самалёт
са́нкі
слі́ва
снег
сне́жань
со́нца
сту́дзень
сшы́так
сяке́ра
сяўба́

**Т**

тава́рыш
таксі́
тале́рка
тра́ктар
тра́ле́йбус
трамва́й
ты́дзень
тэлефо́н

**У**

узго́рак
ураджа́й
урадзі́ць
успамі́н

**Ф**

фа́рба
фе́рма
фізкульту́ра
фу́тра

**Х**

хадзі́ць
хво́ры
хма́ра
хо́лад

**Ц**

цень
цыбу́ля
цырк
ця́жкі (цяжкі́)

**Ч**

чалаве́к
чарапа́ха
чырво́ны
чэ́рвень

**Ш**

шафёр
шко́льнік
шпако́ўня
шчы́ры

**Я**

я́блык
я́блыня
я́гада
язмі́н



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Спіс выкарыстанай літаратуры

*Бадак, А.* Маленькі чалавек у вялікім свеце / А. Бадак. — Мінск : Ураджай, 1995.

Буся : 2016. — № 2; 2019. — № 4.

*Вітка, В.* Выбраныя творы / В. Вітка. — Мінск : Беларус. навука, 2013.

Вясёлка : 1988. — № 11—12; 1990. — № 1, 2, 5, 7, 10, 11, 12.

*Карнеева, Г. А.* Выпраўленне гукавымаўлення ў дзяцей / Г. А. Карнеева. — Мінск : Нар. асвета, 1998.

*Клышка, А. К.* Верасок / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета, 1978.

*Клышка, А. К.* Чую, бачу, гавару : вучэб. наглядны дапам. / А. К. Клышка. — Мінск : Асар, 2013.

*Старжынская, Н. С.* Займальны матэрыял па навучанню грамаце / Н. С. Старжынская. — Мінск : Нар. асвета, 1989.

*Сторажава, Н. А.* Мова мая і твая. Вучу дзяцей па-беларуску / Н. А. Сторажава. — Мінск : Выд. А. Ванін, 1993.

*Шылько, Т. М.* З роднай мовай дзень за днём / Т. М. Шылько. — Мінск : Нар. асвета, 1999.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Змест

**Слова** ........................................ 3
Словы — дзеянні прадметаў ........................... 3
Словы — назвы прымет прадметаў ..................... 26

**Гукі і літары** .................................... 41

**Паўтарэнне** ...................................... 109

Арфаграфічны слоўнік ................................ 126
Спіс выкарыстанай літаратуры ......................... 130



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |


Вучэбнае выданне

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Ляшчынская** Таццяна Лаўрэнцьеўна
**Аніскевіч** Святлана Сцяпанаўна

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання
У дзвюх частках
Частка 2

Галоўны рэдактар *А. У. Лясніцкая*

Рэдактары *Н. Б. Кучмель, І. В. Летуновіч*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастакі *А. Г. Бушкін, Н. У. Табушава*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *А. У. Смалюк*
Карэктары *І. С. Балабановіч, В. Р. Ермаковіч*

Падпісана ў друк 15.11.2019. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,65. Ул.-выд. арк. 4,3+0,2 форз. Тыраж 392 экз. Заказ 532.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ





Цёплы, летні.
Вялікі, галодны.
Беленькі, маленькі.
Салодкае, смачнае.
Шэранькая, баязлівая.
Моцны, зубны.








Круглы, доўгі,
прадаўгаваты.
Салодкі, горкі, кіслы.
Чырвоны, аранжавы,
зялёны, жоўты.





